КУЛЬТУРА

"ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ"

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 37 (1528)
11 верасня 2021 г.

Добры дзень, Горад!

Дзень горада Мінска, які традыцыйна святкуецца ў другую суботу верасня, сёлета адзначаны таксама адкрыццём XIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. Канцэртная праграма з удзелам прадстаўнікоў дваццаці пяці нацыянальнасцей разгортваецца 11 верасня ў самым сэрцы гістарычнага цэнтра сталіцы — Верхнім горадзе. Тут можна пабачыць выставу традыцыйных касцюмаў і прадметаў побыту розных народаў, а таксама пакаштаваць стравы нацыянальнай кухні. Мінск, гістарычна размешчаны на скрыжаванні асноўных шляхоў, заўжды адкрыты для гасцей з усіх краёў і спрадвеку лічыцца шматнацыянальным і шматкультурным горадам, дзе мірна суіснуюць прадстаўнікі розных народаў. Сённяшняе свята яшчэ раз падкрэслівае гэтую даўнюю традыцыю добрасуседства і дэманструе разнастайнасць нацыянальных культур на мінскай зямлі.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

К+3 БЕЛАРУСЬ

Соцыум

БУНТАРНЫ КРАЙ, ШТО НАРАДЖАЕ ТАЛЕНТЫ

У 1935 годзе ўсю Заходнюю Беларусь скаланула вестка аб паўстанні рыбакоў на возеры Нарач. Чым было выкліканае гэтае выступленне, які след яно пакінула ў нашых гісторыі і культуры і якое дачыненне да забастоўкі нарачанцаў меў адзін з народных паэтаў Беларусі? Каб даведацца адказы на гэтыя пытанні, мы вырушылі на Мядзельшчыну. Гэтая вандроўка — першая з шэрагу падарожжаў у рамках сумеснага праекта "К" з тэлеканалам "Беларусь 3", прысвечанага падзеям міжваеннага часу ў Заходняй Беларусі.

ст. 5

Гістарыёграф

КАПЛІЦА АРЭШКАЎ У ЗАКАЗЕЛЛІ

Не так даўно мы распавялі чытачам пра лёс капліц у Бартніках, у Радкоўшчыне, у Багушэвічах. Сёння нас чакае апавяданне пра капліцу роду Арэшкаў у Заказеллі. Яна таксама мае сваю гісторыю, а да таго ж імкліва аднаўляецца.

ст. 14

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

9 771994 478007 21037

Перспектывы росту і змяншэнне затрат

8 верасня адбылася чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў Міністэрства. Дзякуючы сродкам відэасувязі ўдзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

Як паведаміў Анатолій Маркевіч, 7 верасня адбылося пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў, дзе разглядаліся пытанні аб праекце прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2022 год, а таксама аб праекце рэспубліканскага бюджэту на 2022 год і асноўных падыходах па карэкціроўцы Падатковага кодэкса.

Напярэдадні таксама адбылася сустрэча з удзелам віцэ-прэм'ера Ігара Петрышэнкі і намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігара Луцкага з усімі зацікаўленымі па тэме росту заработнай платы ў сферы культуры. Паводле прагнозаў на 2022 год, сярэдняя заработная будзе паднятая і складзе восемсот дзевяноста шэсць рублёў. Таксама разглядаліся пытанні работы дзяржаўных тэатраў, неўзабаве мусяць быць разгледжаныя бізнес-планы дзейнасці тэатраў на 2022 год, якія будуць прадугледжваць змяншэнне затрат і павелічэнне ўласных даходаў.

Як паведаміла начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Ірына Дрыга, напярэдадні Дня народнага адзінства, 14 верасня, у Палацы Незалежнасці адбудзецца выстава "Пояс адзінства", на якой будуць прадстаўленыя творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з усёй краіны. 24 верасня ў Брэсце таксама адбудуцца ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды пяцідзесяцігоддзя мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой".

Па выніках візіту прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Рамана Галоўчанкі ў Гродзенскую вобласць неўзабаве будзе прадстаўлены план дзеянняў па выкананні дадзеных ім даручэнняў, якія датычацца канцэпцыі развіцця Навагрудскага замка і аналізу эфектыўнасці рэстаўрацыйных работ у палацава-паркавым ансамблі ў Свяцку Гродзенскага раёна. У Навагрудскім замку на 2022 год запланаваная рэалізацыя пятага пускавога комплексу, які прадугледжвае работы па кансервацыі Дазорнай, Пасадскай і Уваходнай вежаў. У 2023 годзе ў вежы Шчытоўцы мяркуецца стварыць музейную экспазіцыю.

К

Фотафакт

Рэпетыцыя ў Палацы спорту за дзень да фіналу.

Адна з дваццаці дзевяці

Якраз у гэтыя хвіліны, калі нумар газеты «Культура» здаецца ў друкарню, падыходзіць да завяршэння фінал нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь-21». 29 канкурсантак з усіх рэгіёнаў краіны змагаюцца за тытул самай прыгожай.

На наступным тыдні

У рамках старшынства Рэспублікі Беларусь у Садружнасці Незалежных Дзяржаў у бягучым годзе ў год 30-годдзя Садружнасці 15–16 верасня 2021 года адбудзецца пасяджэнне Савета па культурным супрацоўніцтве дзяржаў-удзельніц СНД. Міністр культуры Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Старшынёй Савета з 2017 года.

У склад Савета ўваходзяць міністры культуры (намеснікі міністраў) краін СНД, якія прымуць удзел у пасяджэнні ў анлайн-фармаце.

Таксама для ўдзелу ў пасяджэнні ў Мінск прыбудуць статс-сакратар Міністэрства культуры, інфармацыі, спорту і моладзевай палітыкі Кыргызскай Рэспублікі Б.Ш. Сякімаў, дырэктар Міжнароднага Дэльфійскага камітэта У.М. Панявін, дырэктар федэральнай дзяржаўнай бюджэтнай навукова-даследчай установы «Расійскі навукова-даследчы інстытут культурнай і прыроднай спадчыны імя Дз.С. Ліхачова» У.У. Арыстархаў.

Пасяджэнне Савета пройдзе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі 15 верасня 2021 года.

16 верасня дэлегацыя наведае Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж", які з'яўляецца базавай арганізацыяй дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па кірунку "музейная справа".

Плануецца, што на пасяджэнні з дакладам "Аб дзяржаўнай палітыцы ў галіне культуры ў Рэспубліцы Беларусь" выступіць Старшыня Савета, міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч.

К

Газета — рэгіёны — чытач

■ ***— Урачыстасці да Дня народнага адзінства будуць доўжыцца фактычна ўвесь месяц, і кульмінацыяй іх стане форум на пляцоўцы Мінск-арэны. У тым ліку сюды запросяць дэлегатаў галіны культуры з усёй краіны. Як рэгіёны рыхтуюцца да мерапрыемства?***

Дзяніс Язерскі, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама:

— Сёння да ўдзелу на форуме адбіраюцца самыя лепшыя супрацоўнікі культуры з усяго рэгіёна, тыя, што ўсталі на абарону незалежнасці і сімвалаў краіны, усіх лепшых каштоўнасцей, якімі жыве беларускі народ. Арганізатар мерапрыемства — Міністэрства культуры, і таму мы ўпэўнены, што яно пройдзе годна. На ім будуць абмяркоўвацца многія актуальныя пытанні галіны культуры, і яно стане яшчэ адной дыялогавай пляцоўкай. Дарэчы, у рамках акцыі "Беларусь адзіная" мы ствараем падобныя пляцоўкі на прадпрыемствах і ў працоўных калектывах. Да нас наведваюцца слынныя людзі: журналісты, пісьменнікі, артысты, у тым ліку з суполкі "Знание", якія дзеляцца сваімі думкамі.

■ ***— У пачатку тыдня адбылася сустрэча з удзелам віцэ-прэм'ера Ігара Петрышэнкі, намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігара Луцкага і міністра культуры Анатолія Маркевіча, на якой абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з павышэннем сярэдняга заробку ў галіне культуры. Прынята рашэнне, што ў наступным годзе ён павінен быць роўным амаль 900 рублям, дакладней — складаць 896 рублёў. А які заробак атрымоўваюць супрацоўнікі культуры ў рэгіёнах цяпер?***

Сяргей Панасюк, начальнік кіравання культуры Брэсцкага аблвыканкама:

— Сапраўды, мы ведаем пра патрэбнасць і жаданне павысіць заробак у галіне культуры. Сёння ў нашай вобласці ён знаходзіцца на агульнарэспубліканскім узроўні і складае 780 рублёў. У Брэсцкім рэгіёне 1022 установы культуры, у якіх працуе 7430 супрацоўнікаў. Самы нізкі заробак — у бібліятэках, самы высокі — у дзіцячых школах мастацтваў.

■ ***— Сёння ёсць думка, што тэатры краіны трэба падштурхнуць да большага самафінансавання. Яна звязаны з тым, каб палова бюджэту тэатраў аплачвалася з дапамогай дзяржавы, а другую палову яны зараблялі самі. Ці рэальна гэта здзейсніць?***

Аляксандр Мікалаевіч Лукашэнка, дырэктар і мастацкі кіраўнік Палесскага драматычнага тэатра:

— На дадзены момант мы сапраўды часткова фінансуемся з гарадскога бюджэту. Але нашы супрацоўнікі і самі зацікаўлены ажыццяўляць большае самафінансаванне. Да эпідэміі каранавірусу наша зала на 110 месцаў на кожным са спектакляў была запоўнена не менш як на 92%. Давалі мы па 20 спектакляў на месяц і рэгулярна іх абнаўлялі, каб заставацца актуальнымі. Дарэчы, кошт на квіткі мы прытрымліваем на даступнай мяжы — на пастановы для дарослых — 7 рублёў, на дзіцячыя — 5 рублёў. І ўрэшце, наш тэатр самаакупаўся на 35%. Таму, калі зменшыць фінансаванне з гарадскога бюджэту, гэта адаб'ецца не толькі на заробках акцёраў, але і на гледачах, бо прыйдзецца павышаць кошт квіткоў, а значыць, мы рызыкуем згубіць нашых наведвальнікаў. Увогуле, можа, рэспубліканскія і абласныя тэатры і змогуць прытрымлівацца дадзенай схемы, але гарадскія, мне падаецца, не. Самае галоўнае пры аптымізацыі фінансавання — падысці да кожнай культурнай установы індывідуальна.

Падрыхтаваў Павел САЛАЎЁЎ

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч; **адказны сакратар** — Ксенія ПАДОЛЬЦАВА; **рэдактар аддзела:** Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Зміцер ЮРКЕВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Павел САЛАЎЁЎ, Ільля СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23.
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2021.
Наклад 2771. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 10.09.2021 у 18.00. Замова 2330.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

Увага! Аб'ява*

Заслуженный коллектив Республики Беларусь Президентский оркестр Республики Беларусь

объявляет конкурс на замещение вакантной должности:
артист эстрадно-симфонического оркестра — клавишные инструменты — 1 чел., на 0,5 ставки.
В конкурсе могут принять участие музыканты с высшим и средним специальным образованием, которые владеют необходимыми навыками и практикой игры в оркестровом коллективе.
Желающие принять участие в конкурсе предоставляют письменное заявление в администрацию Президентского оркестра Республики Беларусь.
К заявлению прилагаются:
1. Личный листок по учету кадров; 2. Автобиография; 3. Копия диплома о высшем или средне-специальном образовании; 4. Характеристика с последнего места работы или учебы; 5. Копия паспорта; 6. Фотография для документов 3*4; 7. Программа выступления до 15 минут: крупная форма и пьеса.
Конкурсная комиссия имеет право предложить участникам прослушивания нотный материал для чтения с листа.
Участники конкурса подают вышеназванные документы с пометкой «На конкурс в администрацию Президентского оркестра Республики Беларусь» до 10.10.2021г.
Дополнительная информация по телефонам: 229 90 08, 229 90 04.

Храм ведаў над Нёманам

У гэтым месяцы ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы адзначаюць два святы: 15 верасня прафесійнае — Дзень бібліятэк Беларусі, і 17 верасня — у Дзень народнага адзінства — 191 год са свайго заснавання. Сустракаць свой дзень народзінаў і Рэспубліканскую ўрачыстасць тут будуць адмысловымі выставамі і мерапрыемствамі.
Наведаўшыся ў найстарэйшы ў краіне храм ведаў над Нёманам, "К" высветліла, што ён — сапраўднае ўпрыгожванне старажытнага Гродна. А па словах маладой дырэктаркі бібліятэкі Марыны Эдвардаўны Ігнатовіч, тут падабраўся калектыў, які працуе для чытача і можа задаволіць любы яго запыт.

Павел САЛАЎЁЎ,
наш кар. / Фота аўтара.
Мінск — Гродна — Мінск.

Святлана Арлюк.

Ударозненне ад іншых абласных бібліятэк, у Гродне бібліятэка не мае агульнага будынка, яна раскідана па 4 карпусах. Затое ўсе змяшчаюцца ў самым цэнтры горада і кожны з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Галоўны корпус знаходзіцца ў былым будынку банка, які быў заснаваны яшчэ за палякамі ў 1930 годзе. Тады гэта была самая вялікая і высокая пабудова ў горадзе. Захоўваліся тут і залатыя зліткі ў адмысловым сховішчы, а цяпер зберагаецца не менш каштоўны скарб — веды. Створаны будынак у стылі канструктывізму, з максімальнай прастатой, інжынер — Ян Клімашэўскі, дарэчы, пляменнік Элаізы Ажэшка.

Усё ў бібліятэцы служыць для камфорту чытача. Ветлівая маладая супрацоўніца Аляксандра Зайцава, твар бібліятэкі, працуе на рэгістрацыі новых асоб.

А вось Людміла Здрадоўская — ветэран бібліятэчнай справы. Яе задача складаць электронны каталог аб артыкулах з часопісаў, таму даводзіцца шмат чытаць. Дапамагае ёй Ганна Даніловіч. Жанчыны разам з юрыстам-практыкам, які наведваецца ў бібліятэку рэгулярна, дапамагаюць усім жадаючым атрымаць рознага кшталту прававыя кансультацыі.

Вось ужо 32 гады працуе ў Гродзенскай бібліятэцы Жанна Маканава. Яе адказнасць — абанемент на 125 тысяч кніг, і яна можа знайсці любую з іх за лічаныя хвіліны. Самае папулярнае, па яе словах, — біяграфіі знакамітых асоб і літаратура пра самаразвіццё.

Алена Кучынская — супрацоўнік краязнаўчага аддзела, а значыць, мае дачыненне да старажытнасцей. Менавіта яна забяспечвае зацікаўленых старымі выданнямі. А кніга, якую яна трымае (на фота), — з 1739 года.

Бібліятэкар Ганна Кісялёва адказвае за выставу, прысвечаную Дню народнага адзінства. Утрымлівае яна матэрыялы і дакументы з архіваў бібліятэкі пра ўз'яднанне Беларусі, а таму даводзіць інфармацыю з першакрыніц. Шмат працы ўклаў у выставу гродзенскі краязнаўца Віктар Саяпін. Выстава будзе вандраваць па прадпрыемствах і ўстановах горада, і Ганна Кісялёва будзе расказваць пра падзеі тых часоў людзям на вытворчасці.

Дарэчы, выставы праводзяцца тут рэгулярна і не пакідаюць нікога абыякавымі. За апошні год — "Гісторыя ў кнізе", "Імя ў кнізе", выстава пра ўсіх Нобелеўскіх лаўрэатаў і іншыя. У цэнтральнай зале галоўнага корпуса таксама праводзяцца розныя мерапрыемствы, у тым ліку творчыя вечары членаў Саюза пісьменнікаў.

У аддзеле бібліятэказнаўства працуе Ірына Раманоўская, якая адказвае за бібліятэкі рэгіёна, курыруе раённыя мерапрыемствы і адмысловыя экспазіцыі, што будуць праводзіцца з нагоды святкавання Года народнага адзінства У кожнай бібліятэцы распрацаваны свой план, як арыгінальна распавесці пра падзеі тых часоў. Жанчына таксама і прафсаюзны лідар. Дарэчы, прафсаюзы дапамаглі 15 сем'ям супрацоўнікаў бібліятэкі пабудаваць і засяліцца ў кватэры, а ўсіх, каму патрэбна, забяспечваюць часовым жытлом.

У пяці хвілінах ад галоўнага корпуса знаходзіцца дзіцячая бібліятэка. У 2015 годзе на яе развіццё выдаткавалі грант Еўрасаюза, за кошт якога адчынілі мультыцэнтр "Совушка", выкананы па лепшых сусветных стандартах. Тут знойдуць магчымасць для свайго развіцця як дашкольнікі, так і дзеці сярэдніх класаў.

Загадчык дзіцячай бібліятэкі Святлана Арлюк — чалавек, апантаны сваёй справай. Хутка яна заканчвае магістратуру бібліятэчнага факультэта БДУКМ. Пад яе кіраўніцтвам супрацоўнікі займаюцца з дзецьмі робататэхнікай — з канструктара дзеці збіраюць мадэлі, а пасля адмысловая праграма запускае іх работу. Такога канструктара хапае на год заняткаў.

Маленькія наведвальнікі цэнтра "Совушка" аддаюць перавагу гульні ў пакоі для лега. Таксама для іх існуюць дзіцячыя камп'ютарныя праграмы, якія дапамагаюць лепш спасцігаць свет, мець поспех у жыцці і вучобе. Шмат увагі ў цэнтры надаецца інклюзіўнай рабоце. Працаваць з асаблівымі дзецьмі дапамагаюць кнігі. Іх сумеснае чытанне і разбор дапамагае дзецям адчуць сябе больш упэўненымі.

Таксама супрацоўнікі гродзенскай дзіцячай бібліятэкі праводзілі конкурс "Лета і кніга". Яны падзяліліся, што ўдзельнічала ў ім шмат чалавек, і чыталі яны нават па 100 кніг за летнія месяцы.

Працяг у наступным нумары.

Тыдзень народнага адзінства ў бібліятэках краіны

У Рэспубліцы Беларусь 17 верасня будзе шырока адзначацца Дзень народнага адзінства. У сувязі з гэтай значнай падзеяй ва ўсіх бібліятэках сеткі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, у тым ліку і ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, на працягу тыдня пройдзе агульнарэспубліканская акцыя пад назвай "Беларусь — краіна адзінства". Акцыя ўключае каля 150 культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў ва ўсіх куточках нашай краіны пад каардынацыяй Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Найважнейшай часткай акцыі стане комплексны цэнтралізаваны выставачны праект "У сям'і адзінай", у рамках якога будуць арганізаваны кніжныя выставы, а таксама фотавыставы ва ўсіх бібліятэках рэспублікі. Праект будзе знаёміць карыстальнікаў бібліятэк з багатай і разнастайнай гісторыяй і культурай роднай зямлі.

Падчас святкавання тыдня народнага адзінства рэалізуюцца культурна-асветніцкія мерапрыемствы, аб'яднаныя дэвізам "З любоўю да Беларусі". Яны паспрыяюць больш глыбокаму вывучэнню нашай дзяржавы, умацаванню ідэі нацыянальнага адзінства і кансалідацыі беларускага грамадства, папулярызацыі беларускай культуры, патрыятычнаму выхаванню насельніцтва рэспублікі.

Сёлета на тыдні народнага адзінства Беларусі 15 верасня будзе святкавацца рэспубліканскае прафесійнае свята Дзень бібліятэк, якое паяднае бібліятэкараў з розных куткоў краіны ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Падчас мерапрыемства адбудзецца ўзнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры", урачыстая перадача Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі рарытэтнага выдання Сімяона Полацкага "Посах кіравання", а таксама іншыя святочныя акцыі.

Алена БЕРАЗОЎСКАЯ,
галоўны спецыяліст упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Неабыякавыя нататкі

З пошты "К"

Праходзілі вякі, адыходзілі ў нябыт пакаленні, знікалі магутныя дзяржавы, а кніга — вялікі цуд, створаны чалавечым розумам, — жыла, хвалявала сэрцы, абуджала думку.

Сцяпан Александровіч

З вялікай цікавасцю прачытаў артыкул Марыны Петрашкевіч "Электронная рэальнасць ці рэальная віртуальнасць" ("Культура", №35, 28.08.2021). Вырашыў падзяліцца сваімі меркаваннямі па акрэсленай праблеме. Прычым праблема бачыцца значна шырэй: не так важна, у якім выглядзе чалавек спажывае духоўную ежу. Горка, што сучаснікі, асабліва моладзь, не чытаюць многія лепшыя ўзоры айчыннай і сусветнай літаратуры. Ёсць людзі, якія абыходзяць кіёскі са свежай прэсай, не наведваюць бібліятэк, не заходзяць у кнігарні... Францішак Скарына казаў: "Любіце кнігу, бо яна — крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы".

Балюча, што шпаркімі тэмпамі падае інтэлектуальная напоўненасць людзей... Чалавек жа з пустымі вачыма, глухім сэрцам і ватнымі мазгамі — усё ж нейкая пародыя на Чалавека.

Добра, што папера і электроніка ў наш час не толькі пасябравалі, але і пачалі актыўна дапаўняць адна адно. Канешне, у транспарце бачым часцей людзей са смартфонамі, аднак ёсць пасажыры і з традыцыйнымі кнігамі, газетамі ў руках. Моладзі ж больш зручна з электроннай чыталкай. Аднак, хто яго ведае, можа, гэта стралялкі, гульні, а не інфармацыйныя парталы з актуальнай палітычнай, эканамічнай, духоўнай інфармацыяй?

Скажу больш: мы амаль што развучыліся хадзіць у тэатры, оперу, філармонію, на выставы, у музеі, затое крочым з дзецьмі ў камп'ютарныя салоны, каб набыць нешта больш мудронае і кручонае — сабе на карысць і іншым на зайздрасць. Аднак ні ў якім разе не трэба забываць, што яшчэ ва ўлонні маці немаўляты слухаюць казкі, якія чытаюць ім таты ды матулі, бабулі ды дзядулі, затым дзеткі праглядаюць малюнкі казачных герояў самі, пазней дзеці ўжо самі чытаюць.

Мы чамусьці забылі, што беларусы атрымалі кнігу з рук Францішка Скарыны 6 жніўня 1517 года першымі сярод усходніх славян. І для нашага народа Кніга — гэта сапраўды нешта асаблівае і святое.

У мяне ёсць любімыя кнігі: яны стаяць асобна на кніжных паліцах. Нават сына назвалі Максімам у гонар майго любімага Аўтара з вялікай літары — Максіма Багдановіча. Традыцыйная кніга валодае і такім феноменам: яна здольная звязаць у адно непарыўнае цэлае аўтара, чытача і таленавіта ўпісаць іх у свае чароўныя старонкі. Гэта неабсяжны ДУХОЎНЫ МОСТ.

Бясспрэчна, разумныя, высокаінтэлектуальныя настаўнікі сёння паспяхова сумяшчаюць у сваёй высакароднай дзейнасці інтэрнэт і традыцыйную кнігу. Яны заўсёды знойдуць магчымасць эфектыўна ўраўнаважыць выкарыстанне гэтых двух рэсурсаў. Добра, што і многія бібліятэкі Беларусі стварылі электронныя кнігасховішчы — так чытачы могуць выбраць зручны для іх варыянт. Больш за тое, ва ўстановах культуры і адукацыі, на прадпрыемствах праводзяцца сустрэчы чытачоў і пісьменнікаў. Такія жывыя творчыя сустрэчы і заклікаюць чытачоў яшчэ больш актыўна падарожнічаць па старонках твораў нацыянальнага прыгожага пісьменства.

Канстанцін КАРНЯЛЮК.
Віцебск.

Народ Кнігі, горад Літары

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ, наш кар.
Мінск — Капыль — Мінск

Калісьці Рыгор Барадулін, маючы на ўвазе ролю, якую адыграла літаратура ў фармаванні нашай нацыі, назваў беларусаў "народам Кнігі". Тут няцяжка правесці паралелі з адным з этнасаў, які пасля страты сваёй бацькаўшчыны і вымушанага блукання сярод чужых народаў стагоддзямі захоўваў, прычым часта ў агрэсіўным альбо нядобразычлівым асяроддзі, духоўную еднасць праз тое, што трымаўся матчынай мовы і сваёй Кнігі. Гэты прыклад учэпістай жыццяздольнасці шмат для каго ў сусветнай гісторыі стаў натхняльным. Несумненна, што і сёння беларускае слова мацуе нацыю, з'яўляецца стрыжнявым чыннікам народнай еднасці. Аднаўленню беларускай дзяржаўнасці сёлета 30 год, а Дзень беларускага пісьменства адзначаецца ў 28-ы раз. Свята амаль равеснік Незалежнасці. І гэта невыпадковае супадзенне: палітычны суверэнітэт патрабуе трывалага духоўнага грунту.

Прымаў Дзень беларускага пісьменства горад Капыль. Асноўныя імпрэзы адбыліся ў нядзелю 5 верасня. Але фактычна свята распачалося яшчэ раней і сімвалічна супала з пачаткам навучальнага года, з Днём ведаў. У першы дзень восені ў мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы адбылося набажэнства, у часе якога ўдзельнікі XXVIII Міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі "Дарога да святыняў", прымеркаванай да Дня беларускага пісьменства, атрымалі блаславенне Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Пасля чаго паломнікі, іх было каля паўсотні — святары, людзі культуры, навукі і мастацтва, — адправіліся ў дарогу з Жыватворным агнём ад Труны Гасподняй. Прайшла экспедыцыя праз 72 паселішчы, маючы канчатковым пунктам Капыль.

Напярэдадні ў сталіцы адбыўся міжнародны круглы стол "Пісьменнік і адзіная гуманітарная прастора". З прычыны ковіду імпрэза сумяшчала інтэрактыўны і вочны фармат. Разам з беларускімі літаратарамі ў дыскусіі бралі ўдзел прадстаўнікі Украіны, Расіі, Нямеччыны, Казахстана, Узбекістана, Балгарыі, Азербайджана. А 4 і 5 верасня свята перайшло і ў Капыль.

Той, хто быў хоць на адным Дні пісьменства, лёгка ўявіць сабе, як святкаваў Капыль. Рэжысура свята склалася даўно, і тое, што адбываецца штогод у розных гарадах, адрозніваецца хіба нейкімі дэталямі. Абавязкова на плошчы ладзіцца сцэна і глядзельная зала пад адкрытым небам. Побач — экспазіцыі беларускай прэсы і кнігадруку, дзіцячай творчасці і народнага мастацтва. Са сваімі выставамі на свята прыязджаюць сталічныя музеі. Заўжды ладзіцца кірмаш, дзе можна набыць і рэчы як сувенірнага характару, так і прыдатныя ў побыце. Кульмінацыя свята — канцэрт сіламі мясцовых артыстаў і сталічнага творчага дэсанту.

Свята пісьменства — гэта магчымасць папулярызацыі сучаснай беларускай літаратуры. На прасторы свята былі вылучаныя лакацыі, дзе пісьменнікі, стоячы ля мікрафона, распавядалі пра свае кнігі. Не скажу, што было шмат цікаўных іх паслухаць. Крыўдна было за майстроў слова. Размова пра літаратуру ва ўмовах кірмашовага тлуму не можа быць плённай, не атрымаецца сумоўя пісьменніка і чытача. Сумоўе патрабуе камернай прасторы і, зрэшты, спецыяльна падрыхтаванай і адпаведна настроенай аўдыторыі.

Мае бацькі былі літаратарамі, і я памятаю за савецкім часам іхнія і іхніх калег развагі пра тое, што бюро прапаганды літаратуры пры тагачасным Саюзе пісьменнікаў робіць нібыта добрую справу, ствараючы магчымасць для літаратараў зарабіць сякую-такую капейчыну праз выступленні ў рабочых калектывах і вайсковых частках. Але адзначалі, што ездзяць на тыя выступленні збольшага асобы далёка не першага шэрагу, а якраз тыя, у каго кепска разыходзяцца наклады. І яшчэ казалі, што ні Аляксандр Сяргеевіч, ні Леў Мікалаевіч, ні Фёдар Міхайлавіч "у народ" не хадзілі. Патрэбы такой не мелі. Сам народ да іх цягнуўся.

Персанажы ў гістарычных касцюмах — звыклы атрыбут такіх свят. Тут пабачыш паненак і кавалераў у шляхецкіх строях, чыё аблічча вяртае нас у часы Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай, а таксама чырвонаармейцаў — воінаў Вялікай Айчыннай.

На леташнім Дні пісьменства ў Бялынічах агульнае замілаванне выклікалі дзве дзяўчынкі, апранутыя анёлкамі. Дык вось за год анёлкі нібыта падраслі, і ў Капылі грамаду віталі ўжо дарослыя анёлы. І зноў было шмат жадаючых сфатаграфавацца з нябеснымі істотамі. Былі яшчэ "жывыя скульптуры" — новы элемент святочнай праграмы. Стаіць такая скульптура, фарбаваная пад бронзу, нерухома, як помнік ці салдат ля маўзалея, а праходзіш паўз яе — усміхаецца і вітае як сябра. Нібыта менавіта цябе чакала. На ранейшых Днях я такога не бачыў.

Кульмінацыя свята — канцэрт, зроблены сіламі мясцовых артыстаў і сталічнага творчага дэсанту.

Святы пісьменства ладзяцца паводле ўсталяванай рэжысуры пры наяўнасці ідэалагічнага чынніка, звязанага з той ці іншай значнай для дзяржавы падзеі. Гэтым разам быў акцэнт на 17 верасня. А рысы ўнікальнасці кожнаму Дню пісьменства надае тая акалічнасць, што ў дні свята гарады ўпрыгожваюцца новымі помнікамі ці манументальна-дэкаратыўнымі кампазіцыямі, у якіх увасабляюцца мясцовая гісторыя і мясцовыя традыцыі. Таму помнік, які ўсталявалі Змітру Жылуновічу, толькі падкрэслівае добрыя традыцыі. Пісьменнік тут малады хлопец-рамеснік, які яшчэ толькі будзе класікам нацыянальнай літаратуры і трагічным героем нацыянальнай гісторыі Цішкам Гартным. Гэта адзін з двух творчых праектаў, рэалізаваных у горадзе з нагоды свята Беларускім саюзам мастакоў.

Другі праект я назваў бы вельмі цікавым па задуме, але выкананым ва ўмовах экстрыму. Каб было больш часу і сродкаў, атрымаўся бы, магчыма, унікальны ва ўсіх адносінах мастацкі твор, а так маем проста якасна зроблена аб'ект, што рэальна ўпрыгожыў Капыль. Я кажу пра Алею пісьменнікаў Капыльшчыны ў гарадскім парку. Як распавядаў аўтар праекта старшыня Беларускага саюза мастакоў Глеб Отчык, замоўшчыкам Алея бачылася шэрагам гранітных памятных знакаў з імёнамі знакамітых землякоў. Нібыта і не кепска, але нагадвала б могілкі. Саюз мастакоў прапанаваў альтэрнатыву — літары беларускага алфавіту. А пры кожнай літары — шыльдачка з імёнамі літаратараў, чые прозвішчы пачынаюцца на гэтую літару. Паколькі ўзгадненне ідэі ішло не так хутка, як хацелася б, уласна на выкананне засталося няшмат часу. Таму ад намеру зрабіць кожную літару як скульптуру, ды яшчэ каб кожная мела непадобную да іншых пластыку, давялося адмовіцца. Быў абраны адзіны для ўсіх шрыфт з шэрагу класічных, і паставілі літары на аднолькавыя пастаменты. Усё адно атрымалася прыгожа, бо літары сусветна значных алфавітаў — гэта ўжо шэдэўры графікі. За кожнай з іх доўгая гісторыя эвалюцыі.

Спадар Глеб разглядае рэалізаваны праект як пілотны. Ужо сёння ён думае пра тое, як аздобіць скульптурамі ў выглядзе літар прастору вакол Нацыянальнай бібліятэкі — зрабіць у Мінску тое, на што падштурхнуў Капыль. Зразумела, гэта будзе іншы маштаб, іншая пластыка, іншыя матэрыялы. Шэраг вядомых нашых мастакоў гатовыя хоць зараз заняцца гэтым праектам.

Калі беларусы — народ Кнігі, дык Капыль сёння — горад Літары. Гэтым ён і застанецца ў гісторыі Дзён пісьменства.

P.S.

Дні пісьменства ладзяцца ў нас штогод, і геаграфія іх пашыраецца. Цудоўна. Але пры гэтым сфера ўжывання беларускай мовы ў нашай краіне апошнім часам звузілася і працягвае драбнець. Гэта кепска. Маю прапанову: на заканчэнні кожнага Дня пісьменства агучваць планы на наступны год па пашырэнні выкарыстання беларускай мовы ў культурніцкай прасторы і сацыяльных практыках.

І каб праз год справаздачу зрабіць.

К

У 1935 годзе ўсю Заходнюю Беларусь скаланула вестка аб паўстанні рыбакоў на возеры Нарач. Чым было выкліканае гэтае выступленне, які след яно пакінула ў нашых гісторыі і культуры і якое дачыненне да забастоўкі нарачанцаў меў адзін з народных паэтаў Беларусі? Каб даведацца адказы на гэтыя пытанні, мы вырушылі на Мядзельшчыну, дзе разгортваліся згаданыя падзеі васьмідзесяцішасцігадовай даўніны. Гэтая вандроўка — адно з шэрагу падарожжаў у рамках сумеснага праекта "К" з тэлеканалам "Беларусь 3", прысвечанага падзеям міжваеннага часу ў Заходняй Беларусі.

Антон РУДАК, наш кар.
Мінск — Мядзел — Мінск

Жыццё беларусаў у складзе польскай дзяржавы вызначалася пэўным нацыянальным і сацыяльным уціскам, які зазнавалі ўсе нацыянальныя меншасці. Зрэшты, меншасцю беларусы маглі лічыцца адно ў межах тагачаснай Польшчы наогул, а тут, у Заходняй Беларусі, альбо, як тады было прынята казаць, "на крэсах усходніх" ("ва ўсходнім краі"), беларускае насельніцтва складала відавочную большасць — палякамі тут сябе лічыла ў асноўным толькі частка нашчадкаў шляхты. Вядома, перасяляліся ў Заходнюю Беларусь і палякі з уласна польскіх тэрыторый — яны збольшага займалі пасады ў адміністрацыі і школьніцтве, шлях на якія быў закрыты беларусам, якіх лічылі нелаяльнымі да польскай дзяржавы. А існавала ж яшчэ і практыка перасялення ў Беларусь і надзялення зямлёй так званых асаднікаў — палякаў з ліку ўдзельнікаў савецка-польскай вайны, якія мусілі, паводле задумы, падтрымліваць польскі дух у гэтым краі.

Такі стан рэчаў абумоўліваў існаванне шматнацыянальнага і шматмоўнага асяроддзя, у якім расло і выхоўвалася пакаленне, да якога адносіўся ўраджэнец Мядзельшчыны Яўген Скурко — будучы народны паэт Беларусі, вядомы пад псеўданімам Максім Танк. Народжаны ў 1912-м, у школьныя гады, з 1923 да 1929-га, ён вымушаны быў змяніць пяць розных школ і гімназій з польскай, рускай і беларускай мовамі навучання — рэч у тым, што рускія і беларускія гімназіі ліквідоўваліся польскімі ўладамі ў выніку вучнёўскіх забастовак, з дапамогай якіх моладзь змагалася за сваё права навучацца на роднай мове. Такая несправядлівасць, у тым ліку, прывяла будучага паэта ў шэрагі змагароў супраць нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту — ён зрабіўся членам Камсамола і Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і ў выніку правёў каля двух гадоў у польскіх турмах. Часам беларусам даводзілася змагацца не толькі за сваю мову ды самасвядомасць, але і за ўласны дабрабыт ды магчымасць забяспечыць сябе.

ЗА ПРАВА ГАСПАДАРЫЦЬ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ

Навуковы супрацоўнік Мядзельскага музея народнай сла-

Карціна Віталя Цвіркі “Паўстанне рыбакоў на возеры Нарач” (1957).

Рыбалавецкія сеткі і якар, паднятыя са дна Нарачы.

Магілы роду Скурко на могілках у Новіках.

Бунтарны край, што нараджае таленты

вы Аляксей Камолаў распавядае, што жыхары Мядзельшчыны ў міжваенныя гады зараблялі сабе на жыццё самымі рознымі спосабамі — сельскай гаспадаркай, гандлем, многія вымушаныя былі, не маючы працы ў родным краі, выязджаць на заробкі ў чужыя краі — у Заходнюю Еўропу і Амерыку, на сезонныя работы часта выпраўляліся ў Латвію. Дзякуючы таму, што ў нарачанскім краі налічваецца каля паўсотні азёр, многім удавалася пракарміць свае сем’і з дапамогай рыбалавецтва. Аднак у сярэдзіне 1930-х гадоў польскі ўрад прыняў шэраг законаў, якія прадугледжвалі нацыяналізацыю прыродных рэсурсаў, у тым ліку перадачу рэк і азёр у веданне дырэкцыі дзяржаўных лясоў. У выніку вольная лоўля рыбы на Нарачы была забароненая, а возера перайшло ў арэнду да памешчыка Яблонскага, і рыбакам было прапанавана наймацца да яго на працу.

Мясцовыя жыхары, якія спрадвек карміліся альбо дарамі возера, альбо сродкамі ад іх продажу, былі незадаволеныя. У маі 1935 года распачаліся выступленні супраць новага парадку карыстання возерам — сяляне з вёсак Пасынкі і Чараўкі рэзалі сеткі, пастаўленыя памешчыцкімі падрадчыкамі, пераварочвалі чаўны з паліцэйскімі, якія імкнуліся задушыць супраціў. Вядома, што, калі рыбакі выйшлі на возера па-ранейшаму лавіць рыбу, а паліцыя на маторнай лодцы накіравалася адабраць у іх улоў, жонкі рыбакоў памкнуліся ў ваду і перакулілі лодку з паліцэйскімі. Вінаватых у “беспарадках” каралі рознымі тэрмінамі зняволення ў турмах Заходняй Беларусі.

Улетку 1935 года бунт нарачанскіх рыбакоў вырашыла падтрымаць Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, якая накіравала сюды для арганізацыі змагання сваіх інструктараў — Аляксандру Шчасную і Аляксандра Багданчука. У выніку ў жніўні быў створаны забастовачны камітэт, які прыняў рашэнне паранейшаму вольна лавіць рыбу, не дапускаць на возера штрэйкбрэхераў і патрабаваць вызвалення арыштаваных таварышаў. Агулам у выступленнях удзельнічалі каля пяці тысяч рыбакоў. Яны адмаўляліся працаваць на арандатара і патрабавалі ўзамен за забарону рыбнай лоўлі атрымаць зямельныя надзелы.

ПАМЯЦЬ АБ ПАЎСТАННІ

На перамовы з рыбакамі прыязджалі павятовы стараста з Паставаў і нават віленскі ваявода. У выніку бунтаўнікі дамагліся пэўных саступак — удзельнікі забастовачнага камітэта нават былі запрошаныя ў Варшаву, дзе іх прынялі прадстаўнікі кабінета міністраў. Змаганне нарачанскіх рыбакоў за вольнае рыбалавецтва цягнулася ажно да пачатку Другой сусветнай вайны. Адметна, што да барацьбы нарачанцаў за свае правы далучыліся таксама рыбакі іншых навакольных азёр, і хваля пратэстаў дакацілася нават да польскага Памор’я.

Максім Танк так уразіўся гэтымі падзеямі, што напісаў у 1937 годзе паэму “Нарач”, у якой распавёў аб барацьбе сваіх землякоў. З-за цэнзурных абмежаванняў твор у тыя гады не мог быць апублікаваны цалкам. Толькі ў 1940 годзе паэту ўдалося ўзнавіць поўны тэкст паэмы, уключаючы фрагменты, якія раней маглі выклікаць незадаволенасць цэнзуры. Выступленні нарачанцаў былі не толькі апяяныя ў літаратуры, але і ўвекавечаныя ў жывапісе — мастакамі Віталём Цвіркам і Кастусём Харашэвічам.

У экспазіцыі мядзельскага музея сёння можна знайсці якар і рыбалавецкія сеткі міжваеннага часу, паднятыя з дна Нарачы, здымкі кіраўнікоў і актыўных удзельнікаў выступлення рыбакоў, арыгіналы іх успамінаў і сведчанняў аб тых падзеях. Побач — матэрыялы аб жыцці Мядзельшчыны ў міжваенныя гады, дакументы аб дзейнасці ў нарачанскім краі Камуністычнай партыі і Камсамола Заходняй Беларусі. Асобны стэнд прысвечаны і Максіму Танку — тут можна пабачыць перададзеныя ім асабістыя дакументы і кнігі з яго аўтографамі. А зусім непадалёк ад музея, на галоўнай плошчы Мядзела — помнік народнаму паэту, усталяваны ў 2014 годзе.

Асабістыя дакументы Максіма Танка.

Фота Антона РУДАКА
Помнік Максіму Танку ў Мядзелі.

РОДНАЯ ШКОЛА

З Мядзела накіроўваемся бліжэй да малой радзімы песняра нарачанскага краю, у аграгарадок Сваткі — у мясцовай школе з 2014 года дзейнічае літаратурна-краязнаўчы музей імя Максіма Танка. Рэч у тым, што некалі будучы паэт і сам вучыўся ў старой сваткаўскай школе, і менавіта тут яму ў рукі ўпершыню трапіла кніга на роднай мове — “Беларускі каляндар” на 1925 год. Кіраўнік музея Святлана Шылько распавядае, што асаблівы гонар для стваральнікаў экспазіцыі ўяўляе сабой радаводнае дрэва народнага паэта, складзенае вучнямі школы пад кіраўніцтвам настаўнікаў паводле архіўных матэрыялаў і сведчанняў сучаснікаў ды сваякоў песняра. Акрамя таго, у музеі захоўваюцца асабістыя дакументы Максіма Танка — тут можна пабачыць арыгіналы пасведчанняў аб наданні паэту звання Героя Сацыялістычнай Працы і прысуджэнні яму Ленінскай прэміі, атрыманай за зборнік “Нарачанскія сосны”, а таксама аб наданні звання народнага паэта Беларусі.

Захоўваецца тут і мноства кніг з аўтографамі Максіма Танка, якія ён асабіста перадаваў у школьную бібліятэку і краязнаўчы музей, які дзейнічаў з 1982 года. У музеі праведзеная вялікая работа па зборы сведчанняў сучаснікаў паэта на яго малой радзіме. Многія колішнія настаўнікі сваткаўскай школы былі знаёмыя з Максімам Танкам, сустракаліся з ім падчас ягоных частых візітаў у родныя мясціны. Усе тутэйшыя жыхары прыгадваюць паэта добрым словам, сведчаць, што ён быў вельмі сціплым і спагадлівым чалавекам, заўжды знаходзіў час, каб паразмаўляць з землякамі, даведацца аб іх жыцці і клопатах.

Максім Танк часта любіў адпачываць з сям’ёй на Нарачы, дзе меў дачны домік, а суседзямі ягонымі былі яшчэ два знакамітыя сябры-літаратары — паэт Аркадзь Куляшоў і празаік Міхась Лынькоў. Сябраваў паэт і з настаўнікам сваткаўскай школы Мікалаем Пашкевічам, які ладзіў з вучнямі літаратурны гурток, у пасяджэннях якога ў розныя часы прымалі ўдзел Янка Брыль, Уладзімір Караткевіч, Іван Навуменка, Васіль Быкаў — апошні, дарэчы, прысвяціў памяці настаўніка, памерлага ў 1972 годзе, сваю аповесць “Абеліск”.

НАВЕЧНА НА МАЛОЙ РАДЗІМЕ

Са Сватак нарэшце накіроўваемся ў родную вёску Максіма Танка, Пількаўшчыну — дакладней, на хутар Хведарцы, што непадалёк ад яе, названы так па імені дзеда паэта, Хведара Скурко, які некалі набыў гэты ўчастак зямлі. Бацькі Максіма Танка, Іван Фёдаравіч і Домна Іванаўна, мелі яшчэ траіх дзяцей — сына Фёдара і дачок Веру ды Людмілу. Разам з сям’ёй тут жыў і бацькаў брат, Фадзей Скурко, які не меў уласнай сям’і, — ён быў вельмі начытаным і дасведчаным чалавекам, наведаў багата замежных краін, ведаў некалькі замежных моў, таму моцна паўплываў на светапогляд будучага паэта. Тут, у Хведарцах, захаваўся яго родны дом — сёння ён таксама належыць сваяку Максіма Танка. Драўляная хата, якой ужо больш за сто гадоў, не так даўно займела статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Непадалёк ад роднай калыскі знайшоў паэт і свой апошні прыстанак. Нягледзячы на ўсе званні ды рэгаліі, Танк з заўжды ўласцівай яму сціпласцю пажадаў быць пахаваным на радзіме, побач з роднымі і блізкімі. Спачывае Максім Танк разам з жонкай Любоўю Асаевіч на могілках суседняй з Пількаўшчынай вёскі Новікі, у самай старой іх частцы, сярод маляўнічых, пакрытых мохам і пахіленых часам надмагілляў. Побач, убаку ад двух велічных каменных крыжоў, злучаных вянком, пад якімі пахаваныя паэт і спадарожніца яго жыцця, ляжаць таксама бацькі і нашчадкі паэта. Максім Танк і ягоная жонка былі аднагодкамі і памерлі таксама ў адзін год, у 1995-м — паэт не змог доўга вытрываць без свайго адзінага на ўсё жыццё кахання. Жыццё і смерць гэтых людзей зрабіліся сапраўдным сімвалам любові і вернасці не толькі адно аднаму, але і свайму народу ды роднай зямлі, без якой яны не ўяўлялі свайго існавання і ў якую вярнуліся на вечны спачын.

К

Ад “непраліваек” да старадаўніх букваро ў

Пачатак новага навучальнага года натхняе музеі на новыя адметныя і крэатыўныя выстаўкі. У Музеі гісторыі горада Мінска ў першы восеньскі дзень такая выстава і адкрылася — называецца яна “Ізноў у школу”. Мабыць, і не знойдзеш чалавека, у душы якога гэтая дата — 1 верасня — не адгукваецца як адна з самых значных і запамінальных: нават праз 20, 30 ці 50 гадоў пасля заканчэння школы мы памятаем пра 1 верасня. А наноў святкуем яго з нашымі дзецьмі і ўнукамі. Музей гісторыі горада Мінска з выставай “Ізноў у школу” зазірнуў у нашу школьную гісторыю: убачыць можна буквары, парты, дошкі, карціны, чарнільніцы — нават сашчэпкі! — і многае іншае. Паглядзім і мы на тое, што чыталі, чым карысталіся школьнікі мінулых часоў.

Надзея КУДРЭЙКА

Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага ўваходзіць у структуру Музея гісторыі горада Мінска і месціцца ў гістарычным цэнтры сталіцы ў будынку — помніку архітэктуры XIX стагоддзя. Менавіта там да канца кастрычніка будзе працаваць экспазіцыя “Ізноў у школу”. Слова “крэатыўны” ўжо прагучала, і недарма: музей запрасіў да супрацоўніцтва цэлы шэраг сваіх партнёраў, каб стварыць нешта цікавае, запамінальнае, а калі мець на ўвазе такую мэтавую катэгорыю наведвальнікаў, як школьнікі, то і досыць займальнае. На ўрачыстым адкрыцці дырэктар музея Галіна Ладзісава згадала асаблівую блізкасць тэмы стваральнікам выстаўкі: бо гэта цяпер яны музейшчыкі, а па першай прафесіі многія з іх — педагогі, сама Галіна Пятроўна калісьці працавала ў сельскай школе.

Канешне, у першую чаргу той, хто зойдзе на выставу, убачыць маленькую драўляную школьную парту — сучасныя навучэнцы такіх ніколі і не бачылі, над ёй — школьную дошку з напісанай формулай, а побач — цемнаскурую дзяўчынку ў школьнай форме і з піянерскім гальштукам: колер скуры манекена даў нагоду пажартаваць, што вось такімі пасля гарачага беларускага лета дзеці ідуць у школу 1 верасня. Уся разам кампазіцыя быццам вяртае гадоў на 50 назад, і справа не ў піянерскім гальштуку, а ў парце: экспанат для выстаўкі прадаставіў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, гэта дакладная копія адной з першых мадэлей школьнай парты, якую яшчэ напрыканцы XIX стагоддзя распрацаваў швейцарска-расійскі гігіеніст, афтальмолаг Фёдар Эрысман. Такія парты з нахіленай працоўнай паверхняй, спінкай і падстаўкай для ног дапамагалі дзецям захоўваць правільную постаць і берагчы зрок. Савецкія школы карысталіся “партамі Эрысмана” яшчэ і ў 70-я, 80-я гады — потым парты пачалі замяняць сталамі. А новая хваля клопату пра здароўе школьнікаў ізноў вывела на паверхню пытанне пра правільную постаць, і прынцыпы “парты Эрысмана” ўжо выкарыстоўваюцца ў сучаснай школьнай мэблі.

І другі экспанат мае цікавую гісторыю — дошка. Насамрэч яна не школьная, а вучэбная, і гэта мемарыяльны прадмет, звязаны з памяццю знакамітага беларускага фізіка Мікалая Барысевіча, які многа гадоў узначальваў Акадэмію навук БССР, атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы, за свае вынаходніцтвы стаў лаўрэатам і Дзяржаўнай прэміі, і Ленінскай. Мікалай Аляксандравіч дажыў да 92 гадоў і пакінуў гэты свет у 2015-м. Згодна з яго пажаданнямі архіў і шэраг каштоўных рэчаў былі перададзены менавіта Музею гісторыі горада Мінска. Як расказала Галіна Ладзісава, проста ён сябраваў з мастаком Міхаілам Савіцкім і хацеў, каб дарагія для яго рэчы знаходзіліся ў галерэі імя яго сябра. Акрамя дакументаў, фотаздымкаў і кніг, ёсць, напрыклад, і чатыры ордэны Леніна, і партрэт Мікалая Барысевіча, напісаны знакамітым мастаком Маем Данцыгам, і карціна, якую яму калісьці падарыў Міхаіл Савіцкі, і многае іншае. Ёсць і дошка з кабінета акадэміка ў Інстытуце фізікі Акадэміі навук Беларусі: формулу аднаго з навуковых адкрыццяў Мікалая Барысевіча на дошцы запісаў яго вучань-аспірант.

На некалькіх вітрынах погляды завабяць кнігі — старадаўнія і не вельмі старадаўнія, але ўжо з пэўнай гістарычнай каштоўнасцю, што называюцца “Буквар”, “Буквар для дарослых”, “Чытанка”, “Лемантар” і г. д. Некаторыя выданні можна назваць проста ўнікальнымі, а тэксты з іх разгорнутых старонак, даступныя для прачытання, здольныя пазабавіць сучасных людзей. Гэтую найкаштоўнейшую калекцыю для выставы падрыхтавала Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь. Самае старое выданне і самае значнае — “Беларускі лемэнтар, або Першая навука чытання” Каруся Каганца 1906 года: кнізе 115 гадоў. Гэта першы буквар на беларускай мове! Выдадзены ён быў у Санкт-Пецярбургу выдавецкай суполкай “Заглянe сонца і ў наша аконца” ажно ў дзвюх версіях — на лацініцы і на кірыліцы. На лацініцы назва пішацца так: Bielaruski lementar abo Pierszaja nawuka czytannia. У гэтым “лемэнтары” ўпершыню была выкарыстана беларуская лінгвістычная тэрміналогія. І гэты буквар, і многія іншыя падручнікі, сабраныя за ўвесь час навучання грамаце па-беларуску, несумненна, выклічуць увагу як школьнікаў, так і людзей, абазнаных у гісторыі, аматараў беларускай культуры і літаратуры. Сярод рэдкіх выданняў — “Лемантар” 1925 года навукоўца-лінгвіста, першага старшыні Інстытута беларускай культуры Сцяпана Некрашэвіча, а таксама падручнікі 1930 года “Ударнік: лемантар для гарадскіх школ граматы”, “Чырвоныя зоркі: лемантар для вёскі. Падручнік для 1-й групы вясковых школ”, “Буквар для дарослых” 1941 года.

Прадстаўлены і пасляваенныя выданні букваро ў, у тым ліку славутыя буквары аўтара Анатоля Клышкі, па якіх вучыліся многія пакаленні: на выставе з радасцю я пазнала чырвоны буквар, які быў у мяне ў першым класе! Якраз сёлета “эпоха Клышкі” скончылася — з гэтага навучальнага года ў школах новыя буквары. Першае выданне буквара Анатоля Клышкі адбылося ў 1969 годзе: з некаторымі ўдакладненнямі і пад рознымі вокладкамі ён перавыдаваўся больш за 40 разоў! Буквар узнагароджваўся залатым медалём Міжнароднай Лейпцыгскай выставы ў 1977 годзе, сярэбраным медалём на ВДНГ СССР, у 1999 годзе атрымаў першую прэмію на конкурсе “Падручнік года” і г. д. Такім чынам, больш за паўстагоддзя дзеці вучыліся па гэтай кнізе. Паўгода таму пісьменнік, паэт і педагог Анатоль Клышка пакінуў гэты свет, разам з ім у гісторыю адышоў і ягоны буквар. На выставе “Ізноў у школу” якраз можна развітацца з эпохай, паглядзеўшы на ўсе выданні беларускіх букваро ў, і букваро ў Анатоля Клышкі ў тым ліку, па якіх дзеці вучыліся роднай мове.

Свае экспанаты для “школьнай” выставы падабраў і знакаміты мінскі калекцыянер Віктар Суворaў: ён паказаў унікальную падборку фарфоравых прадметаў — чарнільніцы, аловачніцы, розныя іншыя прыборы для пісьма. Плюс — разнастайныя статуэткі на тэмы, звязаныя з літаратурай, якую вывучаюць у школе: бюсты пісьменнікаў — ад рускіх класікаў да Якуба Коласа, Янкі Купалы, Адама Міцкевіча, фарфоравыя літаратурныя героі. Асабліва многа на выставе “Ізноў у школу” прадстаўлена рознага роду чарнільніц. Так, калісьці ў школах пісалі чарнілами, і ручак поршневых, у якія чарнілы набіраліся, таксама не было: даводзілася мачаць спецыяльным металічным пяром, ад чаго нярэдка з’яўляліся кляксы. Чарнільніцы-непраліваікі прыдумалі ў XVII стагоддзі ў Англіі, а ў савецкіх школах імі карысталіся яшчэ і ў 80-я гады. Віктар Суворaў прадставіў для выстаўкі досыць значную калекцыю падобных прадметаў: і зусім простых, і сапраўдных фарфоравых твораў мастацтва малой пластыкі. І нават прадэманстраваў усім прысутным на адкрыцці выставы 1 верасня, якім чынам працаваў прынцып “непраліваек”. Выпускалі іх заводы Украіны і Расіі, а адзіны на той час у БССР Мінскі фарфоравы завод чарнільніц не вырабляў.

Увогуле на выставе ёсць што паразглядаць доўга і ўважліва — напрыклад, статуэткі ўсіх герояў твораў Мікалая Гогаля “Рэвізор” і “Мёртвыя душы” ці традыцыйныя для савецкага часу статуэткі школьніка Валодзі Ульянава і г. д. А яшчэ — вялікую, у 336 экзэмпляраў, калекцыю сашчэпак з розных краін, сабраную за гады і дзесяцігоддзі іншым калекцыянерам — Аляксандрам Лугіным. Можна сканцэнтраваць увагу на рэпрадукцыях карцін, прысвечаных школьнай тэматыцы, а за маленькую парту можна і прысесці... Нагадаю, выстава “Ізноў у школу” працуе ў адным з памяшканняў Музея гісторыі горада Мінска — Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага — да 31 кастрычніка. Ёсць цудоўная магчымасць і самім паглядзець, і дзецям паказаць нешта з гісторыі нашай школы.

Беларусь — тэрыторыя кіно

Надзея КУДРЭЙКА

Праз некалькі гадоў у беларускага кіно будзе ўжо векавы юбілей — адлік вядзецца ад 17 снежня (менавіта гэтая дата адзначаецца як Дзень беларускага кіно) 1924 года, калі было створана Упраўленне па справах кіно "Белдзяржкіно": неўзабаве пачалі з'яўляцца першыя хранікальныя і навукова-папулярныя фільмы, следам і першыя ігравыя. У 1928 годзе ўзнікла студыя мастацкіх фільмаў "Савецкая Беларусь", якую ў 1946-м перайменавалі ў "Беларусьфільм" — цяпер яна мае статус Нацыянальнай кінастудыі. Многія і многія беларускія фільмы былі вядомыя і нават папулярныя ў гледачоў усяго Савецкага Саюза: такімі яны застаюцца і цяпер, маюць ужо міжнароднае прызнанне і любоў. У савецкім кіно "Беларусьфільм" меў славу сапраўднага майстра фільмаў, прысвечаных тэме Вялікай Айчыннай вайны, якая сваёй трагедыяй закранула кожнага жыхара нашай рэспублікі. Але славу беларускаму кіно прынеслі і ўсімі любімыя дзіцячыя кінастужкі, і вялікая колькасць анімацыйных фільмаў, на якіх раслі пакаленні і пакаленні дзяцей і якія збіралі і працягваюць збіраць узнагароды на самых галоўных і прэстыжных кінафестывалях свету.

Заснавальнікам беларускага мастацкага кіно лічыцца рэжысёр Юрый Тарыч — менавіта ён аўтар першага беларускага іграваога фільма "Лясная быль" (1926 г.) пра барацьбу з іншаземнымі захопнікамі. Тэма барацьбы народа за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне стала вядучай у беларускім кінематографе 20–30-х гадоў. Знакавыя фільмы таго часу — "Кастусь Каліноўскі" рэжысёра Уладзіміра Гардзіна, "Сосны шумяць" рэжысёра Леаніда Малчанава, "У агні народжаная" рэжысёра Уладзіміра Корш-Сабліна. Неўзабаве пачалі з'яўляцца і фільмы, прысвечаныя сучаснасці, і нават першыя фільмы для дзіцячай аўдыторыі, якія паклалі пачатак такой з'яве, як беларускае кіно для дзяцей. З камедый перадваенных гадоў варта ўспомніць усім вядомыя "Дзяўчына спяшаецца на спатканне" (рэж. Міхаіл Вернэр і Сяргей Сідзялёў) і "Маё каханне" (рэж. Уладзімір Корш-Саблін). Здымаліся ў той час і стужкі паводле літаратурных твораў, і многія іншыя: усяго да 1941 года студыя іграваых фільмаў выпусціла каля 60 карцін.

Вайна змяніла прыярытэты — беларускія кінадакументалісты ўдзельнічалі ў здымках фільмаў, прысвечаных ваенным падзеям, здымалі франтавыя рэпартажы, вялі партызанскі кіналетапіс. У 1942 годзе на базе Цэнтральнай аб'яднанай кінастудыі ў Алма-Аце група творчых супрацоўнікаў беларускага кіно выпусціла альманах "Беларускі кінаборнік", на базе Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў з'явіліся беларускія кінажурнал, поўнаметражны дакументальны фільм і нават фільм-канцэрт "Жыві, родная Беларусь!".

Трагедыя і подзвіг беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне вызначылі тэматыку першых пасляваенных дзесяцігоддзяў у беларускім кіно. Менавіта ў ваеннай тэме кінематограф Беларусі займеў пазнавальныя, нацыянальныя рысы, здымаючы пры гэтым фільмы розных жанраў і рознай стылістычнай накіраванасці. Гэта цэлая эпоха ў нашай нацыянальнай культуры: ад першых вялікіх творчых удач пасляваеннага перыяду — фільма 1949 года "Канстанцін Заслонаў" (рэж. Уладзімір Корш-Саблін і Аляксандр Файнцымер") і фільма 1958 года "Гадзіннік спыніўся апоўначы" (рэж. Мікалай Фігуроўскі) — да кінахіта 2000 года рэжысёра Міхаіла Пташука "У жніўні 44-га...". Усе нават толькі самыя лепшыя і вядомыя работы згадаць немагчыма — іх дзясяткі і дзясяткі. Лідарам савецкага кінапракату ў свой час была стужка "Дзяўчынка шукае бацьку" (1959 г.) рэжысёра Льва Голуба. Фільм Віктара Турава "Праз могілкі" (1964 г.) увайшоў у спіс ЮНЕСКА "100 лепшых фільмаў пра вайну". "Альпійская балада" (1965 г.) Барыса Сцяпанава стала адной з галоўных з'яў савецкага кінематографа таго часу. Самыя першыя песні Уладзіміра Высоцкага пра вайну былі напісаныя для знакавай карціны яго сябра Віктара Турава "Я родам з дзяцінства" (1966 г.). Славутымі сталі фільмы такіх рэжысёраў, як Ігар Дабралюбаў, Валерый Рыбараў, Віталь Чацверыкоў і многіх іншых. Асобна варта вылучыць ваенную драму рэжысёра Элема Клімава "Ідзі і глядзі" паводле сцэнарыя Алеся Адамовіча, знятую сумесна кінастудыямі "Беларусьфільм" і "Масфільм" у 1985 годзе: стужка атрымала нямала прызоў на кінафестывалях, а цяпер у свеце яе часта называюць у пяцёрцы найлепшых фільмаў пра вайну. Згаданы раней фільм Міхаіла Пташука "У жніўні 44-га..." вось ужо некалькі дзесяцігоддзяў не страчвае сваю заслужаную папулярнасць у гледачоў.

І ў наш час кінастудыя "Беларусьфільм" лічыць ваенную тэму адной з галоўных для сябе. З кінастужак ужо новага стагоддзя можна ўспомніць фільмы "Брэсцкая крэпасць" (2010 г.), "Дняпроўскі рубеж" (2009 г.), "Чаклун і Румба" (2007 г.), "Снайпер" (2009 г.).

У першай палове 50-х гадоў экранізаваліся тэатральныя пастаноўкі: "Паўлінка", "Спяваюць жаўрукі", "Хто смяецца апошнім". З 1960-х гадоў пачалі з'яўляцца фільмы пра гісторыю Беларусі, экранізацыі твораў беларускіх пісьменнікаў, фільмы пра сучаснасць, пра каханне... Хто не ведае трагікамедыю "Белыя росы" рэжысёра Ігара Дабралюбава, якую ў 1984 годзе паглядзела больш за 36 мільёнаў кінагледачоў! Яе рэкорд для беларускага кіно праз шэсць гадоў пабіў іншы лідар кінапракату тых часоў — фільм Валерыя Рыбарава "Мяне клічуць Арлекіна".

Беларускае кіно для дзяцей і юнацтва вартае асобнай увагі. Гэтыя фільмы ведала кожнае дзіця не толькі ў тыя гады, калі карціны выходзілі на экран: яны і цяпер не састарэлі, яны і цяпер — у топе кінапраглядаў, кажучы сучаснай мовай. Канешне, у першую чаргу трэба ўспомніць музычныя казкі рэжысёра Леаніда Нячаева — "Прыгоды Бураціна" (1975 г.) і "Пра Чырвоную шапачку" (1977 г.), а таксама "Па сакрэце ўсяму свету" (1977 г.) рэжысёра Ігара Дабралюбава, "Корцік"(1973 г.) і "Бронзавую птушку"(1974 г.) рэжысёра Мікалая Калініна, "Апошняе лета дзяцінства"(1974 г.) і "Вянок санетаў" (1977 г.) рэжысёра Валерыя Рубінчыка.

Падзеяй для савецкага тэлебачання 80-х гадоў стаў беларускі гісторыка-прыгодніцкі серыял "Дзяржаўная граніца", які выходзіў на працягу васьмі гадоў.

За апошнія дзесяцігоддзі беларускае кіно папоўнілася цікавымі работамі, зробленымі на незалежных кінастудыях, і сумеснымі работамі ў супрацоўніцтве Беларусі і іншых краін. Цяпер ідуць здымкі двух серыялаў, прысвечаных знакамітым беларусам: "Першая КінаВідэаКампанія" пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і сумесна з расійскімі партнёрамі здымае фільмы пра музыканта, кіраўніка ВІА "Песняры" Уладзіміра Мулявіна ("За паўгадзіны да вясны") і пра трохразовага алімпійскага чэмпіёна па вольнай барацьбе Аляксандра Мядзведзя ("Дзесяць жыццяў Мядзведзя"). Творы беларускіх рэжысёраў і аўтараў намінуюцца на самыя разнастайныя прэміі і атрымліваюць прызы на кінафестывалях.

Беларускае анімацыйнае кіно сёлета адзначае 50-гадовы юбілей. Анімацыяй Беларусь магла ганарыцца і раней, ганарыцца і сёння: не мінае і тыдня, каб не прыйшла вестка пра чарговую ўзнагароду таго ці іншага кінафестывалю. Гэты год адзначыўся выхадам на экраны першага для Беларусі поўнаметражнага анімацыйнага мюзікла "Зоркі сёмага неба" рэжысёра Алены Туравай.

У свеце кіно Беларусь вядомая не толькі сваімі фільмамі, але і Мінскім міжнародным кінафестывалем "Лістапад", які гэтай восенню пройдзе ўжо 27-ы раз.

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 37 / 11 ВЕРАСНЯ 2021 г.
Art-блог 9

“Пад•Свядомасць”: без карэктываў наратыву

16 верасня на сцэне нашага Музычнага тэатра — адметны балет “Пад•Свядомасць”. Дарэчы, ягонай прэм’ерай завяршаўся сезон. Гэту падзею трэба адзначыць асобна, бо яна знамянуе важны творчы этап у жыцці не толькі маладога беларускага харэографа Сяргея Мікеля, але і ўсяго гэтага тэатра.

Надзея БУНЦЭВІЧ /
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Пастаноўкі Сяргея Мікеля даўно не навіна на беларускай сцэне. А больш дакладна — на розных сцэнах. Бо ў нашым Вялікім тэатры ідзе яго балет “Пер Гюнт”, а ў Музычным — увогуле адразу некалькі паўнавартасных вялікіх спектакляў: “Вішнёвы сад”, адзначаны Нацыянальнай тэатральнай прэміяй, “Тытанік”, дзіцячы балет “Пеця і воўк”. Апошняму папярэднічаў яшчэ больш яскравы “Джэймс і Персік-волат”, на жаль, зняты з рэпертуару. Але называць “Пад Свядомасць” проста чарговым спектаклем нельга: ён сімвалізуе новую прыступку. А больш дакладна — вяртанне харэографа да сябе самога.

Пяць гадоў таму, навучаючыся ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ў класе народнага артыста Беларусі і СССР, прафесара Валянціна Елізар’ева, будучы балетмайстар зладзіў сваю творчую вечарыну “Анатомія танца”. Паслядоўнасць асобных нумароў, пампожная на відэашэраг, складалася ў агульную тэматычна завершаную кампазицыю. А галоўнае, той праект успрымаўся своеасаблівым творчым крэда пачаткоўца, якое ён будзе распрацоўваць надалей: нават у слове “анатомія” бачылася паглыбленне ва ўнутраныя працэсы, а зусім не пераказ нейкіх гісторый з займальным сюжэтам.

Айчынная тэатральная практыка з яе імкненнем да наратыву ўнесла свае карэктывы: малады харэограф павінен быў адысці ад сваіх бессюжэтных спроб, сканцэнтраваўшыся на тых назвах, якія будзе лягчэй прадаць (у цяперашніх умовах такі падыход да фарміравання рэпертуару становіцца пераважным). І толькі зрабіўшы сабе імя, Мікель рушыў, нарэшце, да праславутага “чыстага мастацтва” — да тых пластычных эмацыйна-філасофскіх замалёвак, саму сутнасць і разгорт якіх немагчыма пераказаць ніякай іншай мовай — тымі ж словамі. Толькі харэаграфій — і ніяк не інакш.

Балет “Пад Свядомасць” атрымаў жанравае азначэнне “падарожжа ў снах”. Магчыма, прыхільнікам Музычнага тэатра так прасцей успрымаць спектакль і, што яшчэ больш важна, настроіцца на адпаведную “логіку нелагічнасці”. Але змест балета насамрэч куды больш шырокі: гэта менавіта той выпадак, калі зместам выступае сама мастацкая форма. А назва становіцца ключом да разумення: спектакль трэба ўспрымаць найперш на ўзроўні падсвядомасці, павольна гойдацца на ягоных хвалях, насалоджвацца самой плыняй, а не імкнуцца хутчэй прыстаць да берага ў пошуках апазнавальных знакаў мясцовасці.

На гэта скіроўвае і музыка Арва Пятра, кантрастам да якой становіцца невялічкі фрагмент Эрыка Саці, і сцэнаграфія Яўгена Ермаловіча, блізкая пазітычнаму фэнтэзі, і праца мастака па святле Івана Антанюка, відэапраекцыя Сяргея Чыгіра.

Артысты (а задзейнічаны не толькі вядучыя салісты, але і ўвесь кардэбалет) пераўзыходзяць усе свае магчымасці. Аддаючы такая, бы яны працавалі з сусветнай зоркай, здольнай забяспечыць ім неверагодныя сусветныя ангажэменты.

Пры ўсёй вынаходлівасці харэаграфіі, асабліва ў пранікнёных ансамблевых сцэнах, балетмайстар адыходзіць ад выключна пластычных сродкаў выразнасці. Звяртаецца да тэатра ценяў і, шырэй, да самой эстэтыкі тэатра лялек, калі дзейнай асобай становіцца, да прыкладу, тканіна, што ператвараецца ў аблачынкі, непераадольную сцяну, калыску, купал неба як сімвал бяспекі, вышэйшай аховы і многае іншае. Скарыстоўвае прыёмы цырковага мастацтва ў галіне той жа паветранай гімнастыкі, элементы інсталяцыі, нават чагосьці накшталт тэатралізаванага “слайд-шоу”. Адным словам, ідзе тым шляхам, што пракладзены ў сучаснай харэаграфіі маладым шведскім майстрам Аляксандрам Экманам (дарэчы, у спектаклі ёсць і дакладныя спасылкі да нашумелага экманаўскага балета “Кактусы” і іншых прац). І ў выніку намацвае найбольш актуальны сёння вектар развіцця не толькі харэаграфіі, але і тэатра ўвогуле — на мяжы розных відаў мастацтва, часам надзвычай далёкіх ад асноўнага, акрэсленага выбарам жанру.

Плакаты на “...Вежы”

Учора ў Брэсце ў рамках юбілейнага XXV Міжнароднага тэатральнага фестывалю “Белая Вежа” пачаўся фінальны тур IV Міжнароднага конкурсу тэатральнага плаката. Пераможцы будуць вызначаны на ўрачыстым закрыцці фестывалю — 18 верасня.

Надзея БУНЦЭВІЧ

— Упершыню такі конкурс плаката мы зладзілі ў 2013 годзе, — распавяла дырэктар гуманітарнага праекта “Адэскі брыз”, куратар конкурсу Аляксандра Лабанава. — Ён прайшоў тады ў Адэсе. Наступныя спаборніцтвы праводзіліся ў Іркуцку, Кішынёве, бо штораз мы далучаемся да якога-небудзь тэатральнага форуму, і гэта, спадзяюся, ідзе ўсім на карысць: наш конкурс папулярызуецца ў новай краіне, сярод калектываў — удзельнікаў буйнога форуму, а самі тэатры, да ўсяго, пачынаюць больш клапаціцца пра сваю рэклямную прадукцыю. Першы тур конкурсу ладзіцца анлайн, дасланыя плакаты мы змяшчаем на сваім сайце. Сёлета, да прыкладу, было атрымана ажно 650 творчых прац з 53-х краін свету. На другі тур, які пройдзе ў Брэсце, былі адабраны 72 плакаты.

Мы шукалі найбольш прыдатную форму правядзення спаборніцтва і вызначэння пераможцаў і з цягам часу прыйшлі да неабходнасці мець некалькі розных складаў журы. У адно з іх, зразумела, уваходзяць знаныя мастакі і дызайнеры. А ў другое, што ўпершыню ўзнікла на трэцім такім конкурсе, — тэатральныя крытыкі, тэатразнаўцы, члены экспертнага савета таго фестывалю, да якога мы далучаемся. Абодва журы працуюць цалкам адасоблена, не падглядаюць вынікі адзін аднаго. І, што самае цікавае, вызначаюць розных пераможцаў! Бо, акрамя дасягненняў у жывапісе і графіцы, якім надаюць увагу мастакі і дызайнеры, тэатральныя дзеячы больш глыбока ўнікаюць у тое, наколькі той ці іншы плакат адлюстроўвае сэнс і самога спектакля. Так, напрыклад, на другім конкурсе мастакі практычна пракінулі плакат з Японіі — “Старшы сын” паводле Аляксандра Вампілава: ацанілі шматслойнасць выявы, і не больш. А вось тэатразнаўцы адразу вылучылі яго за багатую інтэртэкстуальнасць, намёкі на вобразны змест і шматлікія ранейшыя ўвасабленні — ажно да савецкай тэлестужкі з Яўгенам Лявонавым. І прысудзілі Спецыяльны прыз тэатральных крытыкаў. Тады і ўзнікла думка скласці асобнае тэатральнае журы.

Глядацкіх журы на конкурсе таксама два. Адно працуе анлайн цягам усіх фестывальных дзён: усе жадаючыя, пачынаючы з дня адкрыцця “Белай Вежы”, змогуць прагледаваць за найбольш цікавыя, на іх погляд, плакаты. Яшчэ аднаго пераможцу вызначаць непасрэдна ўладзе гледачы фестывальных спектакляў: выстаўка плакатаў, што прайшлі ў фінальны тур, змешціцца ў фае Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы, і наведвальнікі змогуць аддаць свой голас, убачыўшы гэтыя творчыя працы жыўцом.

На жаль, гаспадары фестывалю з Брэста ў конкурсе не ўдзельнічаюць: прыём заявак скончыўся яшчэ ў леташнім студзені, але з-за пандэміі фінальныя тур тады не адбыўся і быў перанесены на цяперашні тэатральны форум. Затое, спадзяюся, беларускіх удзельнікаў паболее на наступным конкурсе тэатральнага плаката, бо ў цяперашнім творчым спаборніцтве бярэ ўдзел мастак Юрый Тарэеў з Мінска — і адразу дзве яго працы прайшлі ў другі тур: плакаты да “Фядоры” Сафокла і “Караля Ліра” Шэкспіра.

З любоўю да бацькоў і дзяцей

У Гомельскім гарадскім маладзёжным тэатры ў канцы сезона з’явіўся “Тата”. П’есу сучаснага французскага пісьменніка і драматурга Фларыяна Зелера паставіў мастацкі кіраўнік тэатра Віталь Краўчанка. Спектакль стаў чарговым “моцным арэшкам” для публікі, адначасова салодкім і горкім знутры.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Фота Яўгена Чарнявускага

Апошні вобраз пазычаны з афіш, праграмак, флераў да гэтага спектакля — палова расколатага грэцкага арэха, што нагадвае галаўны мозг. У Гомельскім маладзёжным вельмі паважліва ставяцца да рэкламнай прадукцыі, надаюць вялікае значэнне яе дызайну. Яркі, запамінальны, той доўгі час вярэдзіць памяць, выклікае шырокія асацыятыўныя сувязі і тым самым стварае вобразна-філасофскае “абліччА” спектакля. А галоўнае, прыцягвае адпаведную публіку, гатовую шукаць і знаходзіць ключы да разумення ўбачанага.

Зварот да заходнеёўрапейскай драматургіі канца XX і нават XXI стагоддзяў даўно не навіна для айчынных тэатраў. Як і ўвасабленне п’ес, што сталі кінастужкамі. Ды ўвага рэжысёраў звычайна скіравана на камедыі: маўляў, яны больш блізкія для гледачоў. П’еса ж Зелера, што пазначана аўтарам як трагіфарс і з’яўляецца другой часткай трылогіі “Мама”, “Тата”, “Сын”, прысвечана балючай тэме, часцяком закрытай для грамадскага абмеркавання. Бо ў цэнтры — праблемы чалавечай старасці і яе хвароб, звязаных са стратай памяці. У спектаклі захавана жанравая рыналежнасць — трагічны фарс, але акцэнт пастаўлены на першым слове. Другое ж раскрываецца хіба ў самым пачатку, калі мы ўспрымаем убачанае бы тэатр абсурду. А як інакш ставіцца да таго, што ў ролі дачкі раптам з’яўляецца іншая актрыса? І паводзіць сябе так, быццам нічога не ведае пра тое, што адбывалася літаральна некалькі хвілін таму.

Асаблівасць п’есы ў тым, што мы бачым навакольную рэчаіснасць вачыма галоўнага героя: нейкія новыя, незнаёмыя людзі называюць сябе сваякамі, паводзяць сябе як гаспадары, а з дому пры гэтым знікаюць рэчы. Такі прыём дазваляе ўцяміць, што дзівацкія рэплікі ды выбрыкі старога выкліканы зусім не жаданнем насаліць дачцэ і зяцю. Наадварот, бацька ўпэўнены, што гэта навакольныя яго разыгрываюць, каб пераканаць, што яму патрэбны памагатыя. Навошта? Ён поўны сіл і ў стане самастойна забяспечыць сябе ўсім неабходным. Вось больш не можа патлумачыць папраўдзе невытлумачальнае.

Фота Ігната Рахтава

Сцэнаграфія Крысціны Баранавай вельмі простая, але вобразная і функцыянальная. Чамаданы становяцца шафамі, крэсламі, нават сталом. Празрыстая шырма і дзверы — выхад у іншае вымярэнне. У першым выпадку — да падсвядомасці. У другім — у вечнасць, да смерці. Паліванне фікуса, што перасоўваецца за вяровачку, бы дзіцячая машынка, — сімвал завядзёнкі, што вяртае ў дзяцінства: стары, як гаворыць у такіх выпадках беларусы, здзяцінеў.

Рэжысура сканцэнтравана на акцёрах, якія псіхалагічна дакладна, у поўным сэнсе слова “гіперрэалістычна” ўвасабляюць герояў. Сяргей Чугай (Андрэ), Валерыя Лагута (Ганна), Галіна Анчышкіна (Лора) і раней вылучаліся асаблівым артыстызмам. Але ў цяперашнім спектаклі іх майстэрства ўзрасло яшчэ больш — настолькі, што пры ўсіх тэатральных умоўнасцях вымушае паверыць у рэальнасць падзей і персанажаў, прымерыць іх на сябе. Гэта магчыма яшчэ і таму, што астатнія артысты (Ліза Астрахава, Ірына Чарняўская, Яўген Хромаў ды іншыя) пры ўсёй кантрасным сваіх герояў і асабліва “двайнікоў” не парушаюць агульнай давяральнай атмасферы.

Спектакль выклікае шквал сапраўдных эмоцый. Камусьці ўжо давялося сустрэцца ў жыцці з падобнай з’явай і вырашаць праблему, што рабіць далей: змясціць бацькоў у спецыяльную медыцынскую ўстанову (дарэчы, у нас гэта зрабіць куды складаней, чым у той жа Францыі) ці кінуць працу і даглядаць іх у хатніх умовах, не разлічваючы на падзяку ў адказ. А для кагосьці закранутая тэма — увогуле адкрыццё новых бакоў жыцця. У аншлагавай зале было шмат моладзі, якая сачыла за дзеяннем з не меншай цікавасцю, не хаваючы ў фінале слёз. Бо спектакль на вечную тэму бацькоў і дзяцей заклікае не да спачування ці спагады, а да жыцця. І необходнасці ў цяперашнім мітуслівым свеце распець выказаць словы любові і прызнання сваім родным і блізкім. Бо ў любы момант можа стаць позна — не толькі з-за смерці, але і з-за хваробы, з-за іншых перашкод. Пры ўсёй складанасці праблематыкі спектакль прасякнуты любоўю — да жыцця і людзей. Ці ж не гэтага нам усім так нестае?

“СУ-ТВАРЭННЕ” чакае гасцей…

12 верасня а 17-й гадзіне Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі разам з Цэнтрам беларускай драматургіі запрашаюць на старт дзіцячага праекта “Су-Тварэнне”.

Праект “Су-Тварэнне” — гэта творчая тэатральная пляцоўка для дзяцей ад 4 да 10 гадоў, на якой удзельнікі змогуць паглядзець на казку як на творчы матэрыял для стварэння свайго тэатральнага свету. Дзіцячае мысленне: асабліваe і непаўторнае адчуванне рэальнасці, вера ў прапанаваныя абставіны і непасрэднасць у поглядзе на звыклыя і нецікавыя для дарослых рэчы — галоўная каштоўнасць для стваральнікаў праекта. “Су-Тварэнне” — гэта працэс, у якім ніхто нікога не вучыць, не выпраўляе, а ўзаемазахапляецца, дзеліцца вопытам, слухае адно аднаго і спрабуе думаць вольна і бязмежна.

Першым этапам праекта стане шэраг сустрэч, якія правядуць актрыса РТБД Анастасія Баброва, рэжысёр Яўгенія Давідзенка і мастак Алена Ігруша, дзе праз гульні, размовы і імправізацыю дзеці пазнаёмяцца са светам тэатра знутры. Апынуўшыся ў ролях практыкаў тэатра: мастакоў, акцёраў, рэжысёраў, — удзельнікі на працягу восені ўвасобяць фрагменты казкі і створаць свае вобразы да будучай сцэнаграфіі спектакля.

Аўтар ідэі — мастак Алена Ігруша: “*Сіла дзіцячага малюнка ідзе ад непасрэднасці ўспрымання свету дзіцем, таму любы такі малюнак бездакорны і правільны. Большасць людзей разглядае малюнкі дзяцей паблажліва і нядбайна. Мы ж першапачаткова ставімся да маленькага чалавека як да аўтара. Гэта азначае немагчымасць “выправіць”, “зрабіць крыху лепш” або замяніць хоць які-небудзь элемент афармлення. Наша каманда жадае зразумець дзіця і падбадзіць масток паміж дарослай і дзіцячай культурай.*”

12 верасня адбудзецца першая сустрэча, на якой маленькія творцы змогуць акунуцца ў неверагодныя прыгоды па таемнаму закуллісю тэатра, дзе кожны паспрабуе сябе ў ролях тых, хто стварае спектакль. Хуткімі крокамі ўдзельнікі пройдуць па ўсіх этапах працы над сваім маленькім прадстаўленнем: прыдумаюць унікальную гісторыю і яе герояў, самастойна нададуць імёны і характары персанажам, навучацца ў іх пераўвасабляцца. Створаць уласныя касцюмы, музыку да спектакля і нават дэкарацыі. Ужо ў канцы ўводнай сустрэчы бацькам будзе прапанавана паглядзець мініспектакль, прыдуманы іх дзецьмі.

На працягу верасня і кастрычніка ўдзельнікі праекта будуць сустракацца ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, каб у атмасферы даверу і творчага пошуку даведацца пра дэталі тэатральнага працэсу, атрымаць вопыт працы з мастакамі матэрыяламі і падзяліцца з дарослымі сваім непаўторным адчуваннем свету. Пасля гэтага этапу на аснове дзіцячых малюнкаў Алена Ігруша распрацуе сцэнаграфію да спектакля, які паставіць рэжысёр Яўгенія Давідзенка з акцёрамі тэатра. У Міжнародны дзень аховы дзяцей — 1 чэрвеня 2022 года — удзельнікі праекта сустрэнуцца на прэм’еры пастаноўкі, сапраўднымі стваральнікамі якой яны стануць.

Да ўдзелу ў праекце запрашаюцца дзеці ад 4 да 10 гадоў. Досвед і ўменні не маюць значэння. Удзел у праекце бясплатны.

Жанна ГУРЫНА

Яўген РАГІН

Сапраўдная паэзія не дае душы сканаць. Для мяне цалкам натуральным застаецца тое, што вершамі можна лекаваць… Напрыканцы 1990-х і на пачатку нулявых я працаваў рэдактарам аддзела публіцыстыкі тыднёвіка "Літаратура і мастацтва". Акно кабінета выходзіла на Інстытут замежных моў. Але натхняўся я не толькі выглядам даўгалыгіх студэнтак. Раз-пораз за шыбкай з зайздроснай перыядычнасцю мільгала велічная постаць Сяргея Грахоўскага. "Чарговы верш нясе", — тлумачыў Мікола Гіль. Гэта ўжо потым Алесь Пісьмянкоў зазначыць з веданнем справы: "Вершы пішуць многія, а паэтаў — адзінкі". У "адзінкі", неаспрэчна, увайшоў і сам Пісьмянкоў, аднак найперш — Грахоўскі, Танк, Дубоўка. Я далучыў бы ў спіс і Янку Брыля, бо ягоная проза для мяне — залатой пробы выкшталцоная паэзія.

Ці ёсць вольны час у пенсіянера

На здымках:
1. **Электратэхніка савецкага часу — у экспазіцыі Гудзевіцкага музея.**
2. **Дажынкі ў Ваўкавыску.**
3. **Юныя чытачкі з Тарнова ля выставы "Хата з матчынай душой".**
4. **Ашмянцы рыхтуюцца да юбілею.**
5. **Фота праекта Дзятлаўскага раёна "Адзін дзень з аўтабібліятэкай".**
6. **У Гальшанах і пенсіянеры — танцавальныя зоркі.**

Гэтыя ці не двухметровыя волаты, магутныя маральна ды фізічна, прайшлі праз неймаверныя выпрабаванні і не зламаліся, бо жылі вершамі. А гэта не на зямлі і не на небе. Гэта — паміж. Жылі вершамі і верылі ў лепшае. Так апосталы вераць словам Хрыста. Гэтыя словы і рыфмуюцца як трэба. Усё астатняе — доля бяздумнага графамана.

"Падарожнічаючы па розных краінах, я вынес глыбокае перакананне: на зямлі, апрача дрэў, траў і кветак, усюды растуць і вершы. Я іх знаходзіў на ўсіх сваіх шляхах, на ўсіх кантынентах. Але самыя светлыя, самыя лепшыя я знаходзіў толькі на роднай зямлі". Гэта Максім Танк. Усё так: Айчына жывіць паэзію, тая ў сваю чаргу не дае ачарсцвець і аўтару, і чытачу. Менавіта пявучыя вершы акрыляюць. Нездарма ў дарэвалюцыйных гімназіях вершаскладанне лічылася абавязковай дысцыплінай. Мо мы дарэмна на гэта забыліся? У сем'ях, школах, бібліятэках. Не толькі з дзяцінства, але і цягам усяго жыцця. У Якуба Коласа апрача "пярэсценькага катка Савосева суседа" ёсць яшчэ і Сымон-музыка, "неразлучны са скрыпкай".

Агляд невыпадкова пачну з асобы краязнаўца, літаратара і педагога Алеся Белакоза. Ён стаяў ля вытокаў стварэння ў 1968 годзе школьнага музея ў **Гудзевічах**. Установа неўзабаве праславіла **Мастоўскі** раён і пераўтварылася ў Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей. Я ведаю: спадар Белакоз разбіраўся ў высокай паэзіі. Інакш і не ўзнік бы такі адмысловы музей. Днямі яго старшы навуковы супрацоўнік Лілія Рэйшэль даслала ў рэдакцыю ліст пра адзін з эпізодаў музейнага жыцця. Мы дамовіліся з кіраўніцтвам установы, што навіны пра культурнае жыццё Гудзевічаў стануць на нашых старонках рэгулярнымі. А пакуль — слова Ліліі Іосіфаўне. *"Выстава "Тэхніка і час" дазваляе прасачыць пэўны кавалак нашага жыцця,* — распавядае яна. — *Сярод экспанатаў — цікавыя рэчы даваеннага і пасляваеннага часу: самаробныя шчыпцы для накручвання валасоў, слухавы апарат, гадзіннікі, патэфоны, радыёлы... Дзейнічае і фотазона".* Ад сябе не магу не дадаць, што ў часіны майго юнацтва былі прымачы "Акіян" і "ВЭФ". Па іх мы слухалі польскія радыёстанцыі, якія несупынна транслявалі рок-музыку. Няблага гэтая апаратура прымала і "Голас Амерыкі".

Пра вершы роднай зямлі распавядае бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Лідскай** раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы Кацярына Сандакова. *"Свята "Гаспадарчыя прылады запрашаюць на забавы!"*, — піша яна, — *адбылося ў аграгарадку* **Тарнова**. *Ладзілі кніжную выставу "Хата з матчынай душой", этнаграфічную выставу "Скарбы Бацькаўшчыны". Годна былі прадстаўлены кераміка, кавальства, дрэваапрацоўка, пляценне з прыродных матэрыялаў, ткацтва, вышыўка. Выдатным дадаткам да мерапрыемства сталі нумары супрацоўнікаў* **Тарноўскага** *дома культуры і народных калектываў* **Лідскага** *раёна".* "Хата з матчынай душой" — цудоўная назва. Нечаканым адкрыццём для мяне калісьці стала ўсведамленне таго, што пах вясковай хаты застаецца нязменным цягам усяго яе існавання. Відаць, з такім водарам тут выпякалі хлеб, лясной атмасферы дадавалі свежаадгабляваныя сталешніца і падлога... Ды ці мала яшчэ чым пахне душа жытла?

18 верасня Ашмяны адзначаць 680 гадоў з дня нараджэння. Для тэатралізацыі пашыта ўжо 20 гістарычных касцюмаў.

Мае сыны некалькі нядзель запар збіраюць пад Мінскам баравікі. Кажуць, у лесе столькі прыхільнікаў "ціхага паляванння", што ўражанне такое, нібыта Мінск пусты. Але кожны знаходзіць свой грыб. Для кагосьці, праўда, і мухамор — грыб. Зрэшты, такіх не было ў **Крэйванцах (Ашмяншчына)** на свяце грыбніка. Наадварот, конкурс паказаў, што ў ліку лепшых грыбнікоў — Вера Батурэвіч, Андрэй Янушкевіч, Дар'я Дамбаровіч, Крысціна Міцкевіч.

З **Малабераставіцкай** бібліятэкі (**Бераставіцкі** раён) паведамляюць, што падчас Дня беларускага пісьменства тут адбылася гадзіна гісторыі беларускай кнігі "Славутыя імёны Бацькаўшчыны". Гаворка ішла пра Францыска Скарыну, Ефрасінню Полацкую, Кірылу Тураўскага, Янку Купалу, Якуба Коласа.

Дзмітрый Арцюх, дырэктар **Карэліцкага** раённага краязнаўчага музея распавядае пра тое, што ў зале прыроды з'явіліся QR-коды, пры дапамозе якіх ваш смартфон можа агучыць экспанаты: дазволіць пачуць галасы птушак і звяроў.

Пра цікавы праект напісала і бібліятэкар аўтабібліятэкі з **Дзятлаўскай** раённай бібліятэкі Марына Лапушка. У рамках акцыі "Адзін дзень з аўтабібліятэкай. Выпадковае фота" ладзіцца мерапрыемства "З песняй у кожны дом". Да жыхароў вёсак Раманавічы, Дубраўка, Калпінская, Дзям'янаўцы самадзейныя артысты прывезлі па канцэрту.

Выраз "Калі сыходзіш на заслужаны адпачынак, з'яўляецца шмат вольнага часу" няправільны! Наадварот, пенсіянеру часу хранічна не стае! Ён запісваецца ў шматлікія гурткі, становіцца актыўным чытачом, грамадскім дзеячам, рыбаком, грыбніком і г. д. А прафесійныя работнікі культуры прыходзяць да такога чалавека на дапамогу. Вось таму красамоўны прыклад: у аддзеле культуры і вольнага часу аграгарадка **Гальшаны Ашмянскага** раёна днямі працавала музычная гасцёўня "У кампаніі з баянам". Сабраліся ахвотнікі вясёлых духоўных зносін. Завяршылася мерапрыемства майстар-класам па бытавых танцах.

У **Кальчунах (Ашмяншчына)** ёсць свая Кніга рэкордаў! Запоўнена яна прозвішчамі вяскоўцаў, што вызначыліся ў пэўных намінацыях. Самыя высокі, нізкі, моцны, юны, доўгажыхар, уладальнік самага вялікага і самага маленькага прозвішча... Усіх самых-самых і не пералічыць. 27 жніўня яны атрымалі сувеніры і дыпломы. А павіншаваць пераможцаў прыехалі самадзейныя артысты са **Смаргонскага** раёна.

Пра бібліятэчны open-air "Наш агульны Аўгустоўскі канал" паведамілі з інфармацыйна-бібліятэчнага аддзела **Гродзенскага** раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра. На адкрытым абласным фестывалі народнай творчасці "Аўгустоўскі канал у культуры трох гародаў" бібліятэкары **Сапоцкінскай** гарпасялковай бібліятэкі — цэнтра турызму і краязнаўства, **Раціцкай** сельскай бібліятэкі і работнікі інфармацыйна-бібліятэчнага аддзела Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра падрыхтавалі open-air "Наш агульны Аўгустоўскі канал". Можна было пазнаёміцца з фоталетапісам канала, наведаць літаратурную кавярню.

І напрыканцы сённяшняга агляду — навіна пра раённыя дажынкі ў **Ваўкавыску**. Загадчык аддзела па правядзенні культурных мерапрыемстваў раённага цэнтра культуры Ларыса Ланіна паведаміла: *"Кожная сельскагаспадарчая арганізацыя прывезла на свята караваі з мукі новага ўраджаю. На падворках прэзентаваліся мясцовыя нацыянальныя стравы. Акцыя называлася "Гастра-фэст". Выступілі гурты "Бяседа", "Неруш".*

Песні “ў перахлёст”, прывіды і “Раўгеня”

Як і чым на Полаччыне прываблівацьць турыстаў

Быць прывабнымі і цікавымі для турыстаў — адна з прыярытэтных задач калектыву Полацкага раённага цэнтра культуры. Здаецца, што пакрыху ў нас гэта пачынае атрымлівацца. Да прыкладу, ствараюцца цікавыя лакацыі, насычаныя рэгіянальным культурным прадуктам на аснове традыцый, абрадаў ды свят нашага краю.

Вандроўка ў часе

У бягучым годзе адбылася прэзентацыя турысцка-пазнавальных праграм “Культура і звычаі роднага краю” на базах устаноў культуры раёна з запрашэннем кіраўнікоў аграсядзіб, прадстаўнікоў турыстычнага бізнесу і экскурсаводаў.

Так, Багатырскі сельскі Дом культуры запрашае ўсіх жадаючых на этна-вандроўку “Сувязь часоў”, у рамках якой можна пачуць унікальную спеўную традыцыю выканання народным фальклорным ансамблем “Галасы спадчыны” купальскіх і жніўных песень “у перахлёст”. Традыцыя ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Багатырскі СДК запрашае пазнаёміцца з этнаграфічнай экспазіцыяй у гонар заснавальніцы фальклорнага калектыву Веры Пісюковай, якой, на жаль, ужо няма сярод нас. Можна паўдзельнічаць і ў народных абрадах гадавога і сямейна-абрадавага цыкла, майстар-класах па побытавых танцах і нават паласавацца ўнікальнымі мясцовымі стравамі “Цыбрыкі” і “Раўгеня”. Першая — піражкі з грыбамі, другая — адмысловы напой.

Прывіды запрашаюць

Прывабнай асаблівасцю для турыстаў у Сільніцкім СДК з’яўляецца перш за ўсё сам будынак, у якім размяшчаецца ўстанова культуры — колішняя сядзіба пана Лісоўскага. Таму пачынаецца падарожжа са знаёмства з цікавай гісторыяй мясцовага пана і яго сядзібы, пабудаванай у XVIII стагоддзі. “Сядзіба з’яўляецца месцам містычным, — распавядае Вольга Чобат, кіраўнік фальклорнага ансамбля “Блізнянка”. — Самі па сабе моцуць адчыняцца дзверы ці нечакана зайграе музыка. Нават запрашалі спецыялістаў, якія пацвердзілі наяўнасць паранармальных з’яў”.

У Сільніцкім СДК шануюць ручнікі.

Былы маёнтак пана Лісоўскага.

Танцы ў Багатырскім клубе.

А яшчэ тут на базе бібліятэкі адчынены музей этнаграфіі, экспанаты для якога старанна збірала кіраўнік фальклорнага калектыву разам з мясцовымі жыхарамі. У залежнасці ад пажаданняў турыстаў фальклярысты ладзяць тэатралізаваную дзею “Гадавое кола” ў этнаграфічным кутку Сільніцкага СДК з дэманстрацыяй рэгіянальных абрадавых асаблівасцей, свят Каляды, Вялікдзень, Юр’е, Купалле, Зажынкі, Дажынкі, Радзіны... Мясцовыя стравы: рыбнае шчаўе і таўчонікі з макам заўсёды прыходзяцца даспадобы ўдзельнікам этнаграфічнага экскурсу “Тут кожны крок — гісторыі часціца”, а векавы вяз (па расказах месцічаў) дапамагае набрацца моцы.

Дзе жыў Хруцкі

А вось на базе Палатоўскага СДК у гэтым годзе адчынілася “Мядовая гасцёўня”. Падштурхнула тое, што мясцовае сельгаспрадпрыемства спецыялізуецца на вытворчасці мёду. Пачаць падарожжа ў Палату работнікі СДК прапануюць з наведвання памятнага знака, усталяванага каля вёсцы Захарнічы, дзе жыў знакаміты полацкі мастак Іван Хруцкі, а потым турыстычную групу запрашаюць да крыніцы Пана Казіміра ў в. Казімірова. Трэцяя лакацыя на шляху — пчаліная пасека сельгаспрадпрыемства “Палата”, дзе можна набыць салодкага мядку і скарыстацца паслугай “Сон на пчаліных вуллях”. Паслуга — унікальная. Чалавек кладзецца спаць у спецыяльным дамку, пад якім захоўваюцца вуллі. Кажуць, сон у такіх умовах (пад пчалінае “жу-жу”) вельмі аздараўленчы. Прыязджайце праверце.

Вольга Чобат ля векавога вяза.

Фінал маршруту — “Мядовыя вытокі Палатоўскага краю”. Такую назву мае забаўляльнае мерапрыемства. Работнікі ўстановы культуры праводзяць тэатралізаваную і гульнёвую праграмы ў памяшканні “Мядовай гасцёўні”, знакомяць прысутных з гісторыяй яе стварэння, расказваюць пра ўнікальныя экспанаты пчалярскай справы, прадстаўленыя ў рамках экспазіцыі, частуюць фітагарбатамі з розных траў (па жаданні), мёдам і іншымі салодкімі пачастункамі.“Мы працуем у тандэме з сельгаспрадпрыемствам, — кажа Ірына Ніколенка, загадчык Палатоўскага СДК. —Выгадна ўсім — сельгаспрадпрыемству, таму што мы прывозім турыстаў на пасеку, дзе большасць з іх абавязкова набывае мёд (некаторыя карыстаюцца і іншымі паслугамі), і Дому культуры — маршрут атрымліваецца больш прывабным, насычаным і інфарматыўным.

“Белая птушка” будзе побач

А вось раённы цэнтр культуры прапануе жыхарам і турыстам, якія наведваюць Полаччыну, анімацыйныя групы суправаджэння — мабільныя творчыя калектывы, здольныя выехаць у любую кропку горада і раёна з цікавай праграмай, рэквізітам і касцюмамі: арт-група “Белая птушка”, як сімвал нашай радзімы; нацыянальная парад-група з традыцыйнымі хлебам-соллю; арт-група “Колер радзімы” з канцэртнай праграмай; фольк-м’юзік група “Балагулі”...

Калектыў нашай установы разумее, што канкурэнцыя на рынку турыстычных паслуг высокая. Але, прадстаўляючы ўнікальны турыстычны прадукт, у нас таксама ёсць усе магчымасці быць запатрабаванымі. І мы гэтыя магчымасці імкнёмся выкарыстоўваць.

Аляксей ЗУЕЎ,
намеснік дырэктара Полацкага раённага цэнтра культуры

Фота з архіва Полацкага раённага цэнтра культуры

Майстар голасу і гуку

У канцы жніўня ў чытальнай зале Астравецкай раённай бібліятэкі было асабліва ўтульна. Шчырыя ўсмешкі, добрыя словы і пажаданні, паэтычныя радкі — усё гэта было адрасавана ў гэты дзень аднаму чалавеку.

Кожны жыхар Астраўца і раёна добра ведае імя Аляксандра Якіменкі — спевака, кампазітара і проста адкрытага і таленавітага чалавека. Кампазітар жыве на Астравеччыне з 1978 года. Тут жа нарадзіліся яго напеўныя творы, вядомыя кожнаму з нас.

Аляксандр Якіменка: які ён ў жыцці? Сціплы, разважлівы, поўны энергіі і аптымізму. Больш грунтоўна пра таленавітага аўтара расказала выстава “Майстар голасу і гуку”. Безліч узнагарод рознага ўзроўню, фотаздымкі з мерапрыемстваў, тэксты вядомых твораў былі прадстаўлены для прагляду. Пасля аўтар сам звярнуўся да прысутных, падвёў вынік дзейнасці, падзяліўся планамі і марамі. Жвавы прыгожы чалавек з выдатным пачуццём гумару не пакінуў нікога абыякавым.

Натуральна, гучалі ў гэты дзень і любімыя песні. Слухачы падпявалі кампазітару.

Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ,
бібліятэкар па сувязях з грамадскасцю аддзела бібліятэчнага маркетынгу Астравецкай раённай бібліятэкі

Аляксандр Якіменка з вядучай мерапрыемства Таццянай Падгорскай — загадчыкам аддзела абслугоўвання райбібліятэкі.

Творчая майстэрня.

Сяргей Нагаеў. У руках ганчара — жывая гліна.

Уладар чатырох стыхій

Што робіць нашу зямлю светлай

Вядомы рускі паэт Сяргей Ясенін нарадзіўся ў сяле Канстанцінаве, а праз 76 гадоў у суседнім сяле Волкаве — яго цёзка, вядомы смаргонскі ганчар, член саюза народных майстроў Беларусі. Што збліжае Ясеніна і Нагаева? Любоў да вёскі і прыроды, імкненне да гармоніі, прыгажосці, святла.
Руская зямля нарадзіла Сяргея Нагаева, а на беларускай ён развівае свой талент і духоўна ўзрастае.

КРАЎСКАЯ ГЛІНА І ТЫБЕЦКІЯ ЛАМЫ

У Смаргонь Нагаевы прыехалі ў 1978 годзе. Тут Сяргей скончыў СШ №3, паступіў у Бабруйскае мастацкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча. А ў 1993 годзе разам з братам стварыў сваю творчую майстэрню, якая размясцілася ў старым будынку колішняга Святлянскага клуба. Прайшлі гады — брат захапіўся сталярнай справай. А Сяргей ператварыў стары клуб у прывабную сядзібу, дзе не толькі займаецца ганчарствам, але і праводзіць майстар-класы, урокі творчасці.

"Тое, што я зарабляю, укладваю ў гэты куток зямлі. Ён знаходзіцца ў Святлянах. Хочацца, каб ён сапраўды быў светлым", — робіць важны акцэнт Сяргей.

Сяргей перахоплівае мой позірк, накіраваны на дом, — і адразу адказвае на пытанне, якое я толькі збіралася задаць. "Люблю такую архітэктуру, якая ўпісваецца ў прыроду і не псуе яе. Гэты дом атынкаваны, аздоблены старадаўняй цэглай ручной работы... Лічу, што архітэктура павінна быць часткай прыроды, — зазначае мой суразмоўца.

У двары прыцягвае ўвагу нязвыклы элемент дызайну — курган. Аказалася, гэта запас гліны, прывезенай з-пад Крэва. "Менавіта крэўская гліна лічыцца лепшай не толькі ў Беларусі. У ёй — высокая колькасць мінералаў, што дазваляе ёй быць вогнетрывалай. Пра жыватворныя якасці крэўскіх "залежаў" ведаюць нават тыбецкія ламы (пра гэта расказаў чалавек, які пабываў на Тыбеце). Гліна мае гаючую сілу, таму той, хто тут, у майстэрні, лепіць, яшчэ і лечыцца".

Прычым як фізічна, так і псіхалагічна.

НЕ ЗГАРАЦЬ, А ЗАГАРТУЮЦЦА

Для Сяргея гліна амаль жывая істота, адухоўленая ўсімі зямнымі стыхіямі. Каб яе тэхналагічныя параметры палепшыліся, каб гліна "ажыла", яна павінна вылежыцца на вуліцы хаця б пяць гадоў і прайсці ўсе стадыі "выпрабавання" — перамерзнуць, абветрыцца, патрэскацца, вымыцца дажджом.

Версія пра "жывую" гліну ўзнікла не на пустым месцы. Памятаеце, згодна з біблейскім пісаннем, Бог стварыў чалавека менавіта з кавалка гліны...

"Ад вытокаў" — так майстар называе тэхналогію, па якой працуе. Ні адзін завод яе не выкарыстоўвае.

Пасля пэўных тэхналогій апрацоўкі кераміка — нават мацнейшая за жалеза. Дарэчы, так гартуецца і чалавечы дух — праз выпрабаванні.

Сяргей не пакрывае посуд глазурай, а выкарыстоўвае малачэнне (або малочны абпал) — старажытны спосаб апрацоўкі керамікі. Пасля такога абпалу выраб набывае прыгожы карычневы колер розных адценняў. Для малочнага абпалу бярэцца выраб, які прайшоў першапачатковы абпал (пабываў у печы амаль пры 1000 градусаў), прамочваецца ў натуральнае тлустае каровіна малако. Потым яшчэ раз абпальваецца пры тэмпературы 270-350 градусаў (пры тэмпературы звыш 400 градусаў малако выгарае, працэс патрабуе вялікай увагі). У выніку змяняецца не толькі знешні выгляд: поры вырабу ўбіраюць у сябе малако, у такім посудзе прадукты могуць доўга захоўвацца, не кіснуць.

Але і гэта яшчэ не ўсё. Наступны этап — вашчэнне. Калі яшчэ цёплую кераміку пакрываюць "кактэйлем" з пчалінага воску і алею, пасля чаго порыстая па сваёй прыродзе гліна становіцца водаданепранікальнай.

"Тэракотавыя" — так па-сучаснаму называюцца вырабы з чырвонай гліны. Яны маюць вельмі прыемную, далікатную структуру. Ежа ў іх не прыгарае, захоўвае шмат пекціну, якім жывіцца клетка чалавека. І што не малаважна: экапосуд нясе памяць пакаленняў.

ДЗІЦЯ — ГЛІНА, МАЦІ — ГАНЧАР

(узбекская народная прыказка)

Сяргей вельмі трапятліва ставіцца да сваёй справы, сваё прызванне называе "божым промыслам". Ганчарства — гэта не толькі зляпіць і абпаліць, але і касмалогія разумення жыцця. "У ганчарнай справе можна прасачыць шлях чалавека на зямлі. Гліняныя вырабы праходзяць усе этапы "выхавання" і "сталення". Ствараючы рэч, на ўсіх этапах можна ўбачыць, як "выхоўваецца" кусок гліны, а ў выніку вызначаецца яго прыналежнасць: у адным — захоўваць напоі, у другім — тушыць ежу... Сваё прызначэнне мае і кожны чалавек. Як я раблю гаршкі на ганчарным крузе, так праяўляецца касмалогія Сусвету", — думку ганчара складана зразумець адразу.

Але Сяргей дае тлумачэнні — і ўсё становіцца на свае месцы: "Кожны чалавек нараджаецца "крывым". Пакуль ён малы, бегае, крыўляецца. Нельга сказаць, што з гадамі чалавек перастае гэтым займацца, але ўсё ж ён мяняецца...

Калі кавалачак гліны я буду шкадаваць, з яго нічога не атрымаецца. Калі бацькі дзяцей шкадуюць, з імі нічога не будзе. Кавалак гліны трэба ляпіць, лю-БІЦЬ (каб у кожнай "людзіне" нарадзіўся чалавек). Чалавек — гэта свет, які жыве ў целе, гэта маральныя ўчынкі. Асоба — той, хто бачыць свае недахопы, змагаецца з імі, перамагае сябе".

"Каб стаць сапраўдным ганчаром, трэба зразумець сутнасць матэрыялу, сваё прызначэнне і ўвесь час духоўна расці. Дарэчы, раней майстар у вучні браў аднаго чалавека. І гэты вучань толькі пяць гадоў падмятаў майстэрню — ён павінен быў зразумець сутнасць ганчарства. Пасля яшчэ пяць гадоў асвойваў ганчарны круг — і толькі тады здаваў экзамен. Гэты прыклад яшчэ раз даказвае: у любой справе, каб дабіцца толку, трэба прысвяціць ёй не менш за 10 гадоў. І гэта толькі першая ступень далейшага толку".

З дзецьмі на занятках у "Школе творчасці" ганчар таксама праводзіць цікавыя размовы. Вучыць іх бачыць прыгажосць. Ганчар упэўнены: "Любое дзіця найперш павінна творча развівацца. Калі яно не выхоўваецца ў творчасці, яму нельга выкладаць дакладныя навукі. Без фантазіі нельга стварыць эстэтычную рэч. Бог — найперш творца, з усяго робіць хараство".

Сярод керамічных вырабаў Святлянскага кераміста я выдзеліла глінянага мужычка Ямелю. Прыкладна так я ўяўляла героя вядомай казкі. Для майстра гэты персанаж — зусім не гультай, а сімвал удумлівасці, спакою, разважлівасці. Мітусня — прыкмета людзей павярхоўных. А каб стварыць вартасную рэч, патрэбны моцныя рукі і спакойная галава.

Галіна АНТОНАВА
Смаргонь
Фота аўтара.

Вырабы Сяргея Нагаева найперш можна пазнаць па літары "Н", якую кераміст выводзіць на кожнай сваёй рабоце.

У такіх гаршчочках ежа не прыгарае, яна не проста здаровая, а лячэбная, карысная для тых, у каго праблемы са страўнікам.

Рэспубліканская выстава мастацкага тэкстылю "Мроі-крылы" адкрылася 7 верасня ў двух музеях Віцебска. Віцебск пераняў эстафету ад Гродна, дзе праект экспанаваўся ўвесну: сярод майстроў з усёй краіны ў віцебскіх мастакоў з'явілася магчымасць больш поўна паказаць сваю творчасць. "Бо Віцебск жа сталіца тэкстылю, віцебская тэкстыльная школа асаблівая!" — з гонарам гавораць мясцовыя мастакі. Урачыстыя адкрыцці экспазіцый у Віцебскім мастацкім музеі і ў Арт-прасторы на Талстога, 7, Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва сабралі вялікую колькасць зацікаўленых людзей — і саміх мастакоў, і аматараў мастацтва, і прадстаўнікоў Беларускага саюза мастакоў, і — студэнтаў.

Надзея КУДРЭЙКА

Чаму варта асобна вылучыць студэнтаў — бо акрамя знакамітага мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага ўніверсітэта ў Віцебску ёсць кафедра дызайну і моды ў Дзяржаўным тэхналагічным універсітэце: там тэкстылем займаюцца на прафесійным узроўні. А яшчэ ёсць дзве спецыялізаваныя ўстановы сярэдняй адукацыі, дзе вывучаюць сярод іншага і тэкстыль, ткацтва. Рэспубліканская выстава "Мроі-крылы" ў Віцебску аб'яднала работы і прызнаных майстроў, і работы студэнтаў. Выстаўляюцца работы выкладчыкаў Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта Наталлі Лісоўскай, Ірыны Кірылавай, Таццяны Маклаковай, Святланы Оксінь. А яшчэ на адкрыцці ў Мастацкім музеі быў зладжаны паказ моднай калекцыі: менавіта ён сабраў вялікі натоўп моладзі. Студэнцкі тэатр моды тэхналагічнага ўніверсітэта прадэманстраваў калекцыю Sweet look таксама студэнта факультэта дызайну Мікіты Захарчука — менавіта з ёй Мікіта сёлета стаў лаўрэатам фестывалю-конкурсу "Млын моды — 2021". У аснове вобразаў — салодкая фіялетавая цыбуля з яе шматлікімі слаямі: такім чынам абыгрываецца назва калекцыі. Белую бязь Мікіта ўласнаруч па-

Студэнцкі тэатр моды ВДТУ паказвае калекцыю Мікіты Захарчука Sweet look.

На выставе ў Віцебскім мастацкім музеі.

Тканыя крылы і мроі пра палёт

фарбаваў у розныя колеры, а касцюмы пабудаваў на прынцыпах мнагаслойнасці і геаметрычных фігур.

Асноўны арганізатар праекта Рэспубліканскай выставы "Мроі-крылы" — Беларускі саюз мастакоў, творы для выставы адбірала экспертная група Саюза, а над самой выставай працавала каманда куратараў. Падрыхтоўка Рэспубліканскай выставы — справа няхуткая. Аўтарам ідэі "Мроі-крылы" была Ала Непачаловіч — мастак, педагог, сапраўдны рухавік беларускага ткацтва і габелена, майстар, якая мела аўтарытэт і прызнанне: летась яна атрымала званне лаўрэата Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва, яе габелены ўпрыгожваюць Палац незалежнасці і Нацыянальную бібліятэку Рэспублікі Беларусь, захоўваюцца ў дзяржаўных музеях, вядомыя ва ўсім свеце. На самым пачатку года Ала Іванаўна пакінула гэты свет. Асобная частка экспазіцыі ў Віцебскім мастацкім музеі прысвечана яе памяці і памяці яшчэ двух знаных майстроў, якія стаялі ля вытокаў вялікіх выставак мастацкага тэкстылю і якіх сёлета таксама не стала, — Ларысы Густавай і Уладзіміра Лісавенкі. Менавіта іх творы размешчаны ў цэнтральнай частцы экспазіцыі, іх імёны з удзячнасцю былі згаданыя ў прамовах калег на адкрыцці.

Ідэя выставы адлюстраваная ў назве. Як сказана ў анатацыі: "Аўтары праекта "Мроі-крылы" Ала Непачаловіч, Вольга Рэднікіна, Алена Обадава і Наталля Лісоўская прапанавалі мастакам магчымасць узвысіцца над простай рэальнасцю, адлюстраваць свае мары і фантазіі ў вобразных рашэннях творчых работ, узяўшы за аснову сімвалізм птушкі і палёту або вобразна перадаўшы саму мару пра палёт". Такім чынам,

Наталля Лісоўская. "Дом. Печка. Дрэва".

Антаніна Гуршчанкова. "У патоку".

у Віцебскім мастацкім музеі прадстаўлены творы 30 прафесійных мастакоў з Мінска, Полацка, Гомеля, Гродна, Брэста, Віцебска і іншых гарадоў. Усіх немагчыма пералічыць, дазволю толькі невялічкі спіс прозвішчаў: Валянціна Бартлава, Ніна Пілюзіна, Людміла Петруль, Наталля Смоляк, Галіна Крыва блоцкая, Наталля Шапавалава, Алена Шаціла... Так, усе мастакі — жанчыны: мужчыны ў гэтым тэкстыльным свеце вялікая рэдкасць.

Работы на выставе самыя розныя, з самымі рознымі тэхнікамі. На гэта ўвагу гасцей звярнула член куратарскай групы Алена Обадава: "Кожны мастак па тэкстылі заклапочаны не толькі тэмай і выяўленчымі сродкамі, але і пошукам матэрыялу. Тут мы можам убачыць і шэрсць, і бавоўну, і лён, і акрыл, і самыя нечаканыя матэрыялы: металічны дрот, папяровыя шнуры, рэзаныя джынсы... Можам убачыць і традыцыйнае ткацтва — рамізнае і іншае, а можам і змяшаныя тэхнікі, і нейкія нечаканыя рашэнні".

Выставы мастацкага тэкстылю ў Віцебску адбываюцца даўно, адбываюцца часта. А з 2009 года склалася традыцыя і вялікіх рэспубліканскіх, нават міжнародных выстаў. Адна з мастачак, член куратарскай групы віцебскай версіі выставы — Наталля Лісоўская, дацэнт кафедры дызайну і моды Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Менавіта яна актыўна рухае тэкстыльнае мастацтва ў Віцебску, яна ў цэнтры падзей, якія часта сама і прыдумляе і арганізоўвае. Наталля Сяргееўна згадвае, як калісьці натхнілася Біенале дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Мінску і задумала падобныя падзеі ладзіць і ў Віцебску. З таго часу тут прайшлі такія вялікія фестывалі, як "Беларускі тэкстыль", "Каляровая нізка", "Сугучча", "Связующая нить" і многія іншыя, некаторыя з якіх былі міжнароднымі.

Так склалася, што ўласны праект Наталлі Лісоўскай — выстава "Цяпло нашага дома", што ішла летам ў Арт-прасторы на Талстога, 7, — была працягнута і стала часткай Рэспубліканскай выставы "Мроі-крылы". Калідоры Мастацкага музея не здолелі ўмясціць усе работы, і вялікая частка твораў — у тым ліку і творы студэнтаў розных ВНУ Беларусі, у першую чаргу Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, — заняла месца ў гэтым крэатыўным памяшканні Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва на Талстога, 7. Крэатыўная гэтая прастора, можа, не ад вялікага багацця — будынак у самым цэнтры горада неадрамантаваны, непрычасаны, але ж з вельмі багемным выглядам і жывым духам: мастакі і іх паклоннікі, перамясціўшыся сюды пасля афіцыйнага адкрыцця ў Мастацкім музеі, нават разняволіліся і развесяліліся. Як адзначыла першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля Шаранговіч, "самі гэтыя сцены прымусілі творы загучаць па-новаму". І дадала: "Часы зараз вельмі няпростыя, і часта можна пачуць — а навошта, а які сэнс у выставах, у творчасці? Але ж сэнс нашага існавання менавіта ў тым, што мы павінны нешта ствараць. Я ў захапленні ад таго, як вось у гэтай арт-прасторы гучыць тэкстыль — бо гэта тое мастацтва, якое можа трасфармавацца і хутка рабіць любое памяшканне сваім: яно можа быць і ў пампезных залах, і ў такіх дастаткова авангардных. Таму што гэта — сапраўднае мастацтва. Шчыра дзякую мастакам, што вы працуеце, што не апускаеце рукі".

Рэспубліканская выстава мастацкага тэкстылю "Мроі-крылы" будзе працаваць да 3 кастрычніка ў Віцебскім мастацкім музеі і ў Арт-прасторы на Талстога, 7, Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва.

К

Наталля Канькова. "Настрой".

Марыя Барысенка. "Мне сніўся Піцер".

Не так даўно мы распавялі чытачам пра лёс капліц Слізеняў у Бартніках, Манюшкаў у Радкоўшчыне. У мінулым нумары мой калега Павал Салаўёў раскрыў нашым чытачам таямніцы капліцы ў Багушэвічах, гісторыя якой шчыльна звязана з родам Святарэцкіх, аднаго з прадстаўнікоў якога Уладзімір Караткевіч зрабіў у "Каласах пад сярпом тваім" прататыпам Раўбіча. Сёння нас чакае апавяданне пра капліцу роду Арэшкаў у Заказеллі. Яна таксама мае сваю гісторыю, а да таго ж імкліва аднаўляецца.

Зміцер ЮРКЕВІЧ

Напалеон Орда. Капліца ў Заказеллі (1850).

Капліца Арэшкаў у Заказеллі,

або Пра беларускі Нотр-Дам

Рамуальд Траўгут (каля 1862 года).

Эліза Арэшка.

Клопат аб продках і нашчадках

У свой час капліцы-пахавальні былі неад'емным атрыбутам шляхецкіх маёнткаў. Пераважна тых, чые гаспадары валодалі гэтымі маёнткамі не адзін дзясятак год, ад продкаў. Або планавалі жыць тут вечна. Сведкі гэтага клопату — капліцы-пахавальні ў Грушаўцы і Усаве, якія належалі Рэйтанам, Завушшы Мараўскіх, Сар'і Лапацінскіх, Верхнім Чэрніхаве Рдултоўскіх і многія іншыя. Большая частка гэтых помнікаў-сведкаў у розны час была разрабаваная і апаганеная вандаламі, а сёння закінутая і руйнуецца. Але некаторым пашанцавала атрымаць другі шанец. Тая ж капліца Святарэцкіх або Рэйтанаў у Грушаўцы, на якой год таму пачаліся аднаўленчыя працы (пра яе лёс мы плануем распавесці ў бліжэйшых нумарах). Пашанцавала і капліцы роду Арэшкаў, якая лічыцца адным з першых помнікаў архітэктуры неагатычнага стылю на беларускіх землях.

Арэшкі герба "Кораб"

Род Арэшкаў з'яўляецца адным з самых старажытных беларускіх шляхецкіх родаў. Згадкі аб іх сягаюць у самы пачатак XVI стагоддзя. У 1528 годзе мельніцкі зямянін Падляшскага ваяводства ВКЛ Ян Арэшка выставіў на попісе вялікалітоўскага войска 8 коней, што ў тыя часы сведчыла аб немалым дастатку. Нашчадкі Яна фігуруюць і ў пазнейшых попісах войска ВКЛ 1565 і 1567 гадоў. Пазней род разросся і разгалінаваўся. Частка Арэшкаў атабарылася ў Берасцейскім, Троцкім і Наваградскім ваяводствах ВКЛ. Дарэчы, з той галіны, якая паходзіла ад мельніцкага войскага Мельхіёра, паходзіць і бабуля Адама Міцкевіча, якая была замужам за Мацеем Маеўскім, чомбраўскім эканомам.

На Драгіччыне Арэшкі, акрамя Заказелля, валодалі яшчэ і Людвінавым, якое належала Пятру Арэшку. Ён у 1858 годзе ажаніўся з шаснаццацігадовай Альжбетай Паўлоўскай. Увайшла яна ў нашу гісторыю як пісьменніца Эліза Ажэшка.

Заказель жа ў той час належаў Калікту Арэшку, маршалку шляхты гарадзенскага павета, камер-юнкеру пецярбургскага двара і сябру галоўнай камісіі па справах сялян. Разам з жонкай Эміліяй Скірмунт стаў бацькам чатырох сыноў і дзвюх дачок. Сын Нікадзім, названы ў гонар дзеда, быў удзельнікам паўстання 1863 года і ў адным з баёў з расійскім войскам быў забіты. У гонар загінулага сына і яго паплечнікаў у Заказеллі была пастаўлена невялічкая капліча-помнік (захавалася даваеннае фота). Бралі ўдзел у паўстанні, воляй або няволяй, і гаспадары Людвінава — браты Фларыян і Пётр Арэшкі, а таксама і сама Эліза.

У 1893 годзе, ужо пасля смерці Калікста Арэшкі, яго нашчадкі прадалі Заказель графіні Надзеі Бобрынскай. Ад Бобрынскіх маёнтак перайшоў да Зыгмунта Весялоўскага (1922). А з 1923 па 1944 год гаспадаром быў Караль Талочка.

З інспірацыі жонкі

Лічыцца, што пабудаваць капліцу-пахавальню ў Заказеллі натхніла свайго мужа Нікадзіма Арэшку Фердынанда Крыжаноўская. Аўтарам праекта стаў польскі і беларускі архітэктар Францішак Яшчалд, аўтара праектаў некаторых палацаў у Беларусі — у Карчава, Кавярдзяках, Вістычах — і разам з Уладыславам Марконі ў Косаве, а таксама ў Польшчы.

Будавалася капліца ў 1830-х гадах з дазволу віленскага біскупа Андрэя Клангевіча і завершана была, верагодна, у 1839 годзе. У 1843 годзе там спачыў яе будаўнік — Нікадзім Арэшка. Пазней у крыптах капліцы былі пахаваны іншыя прадстаўнікі роду. Сама ж капліца пэўны час выконвала функцыю касцёла. Цікава, што падчас паўстання 1863 года пад страхой капліцы нібыта хаваўся цяжка паранены Рамуальд Траўгут, апошні кіраўнік паўстання. Апекавалася ім Эліза Арэшка.

Пасля таго як Заказель пакінулі Арэшкі, капліца спакваля прыйшла ў заняпад. І, калі б не Караль Талочка, які накрыў аварыйны дах ацынкаванай бляхай, магчыма, сёння не было б чаго і аднаўляць. Да Другой сусветнай вайны труны з парэшткамі Арэшкаў захоўвалі ў недатыкальнасці. Але пазней усё прыйшло ў рух.

Фота BrestCity

Фота драгічынскага раённага выканкама

З небыцця

Калі ў 2008 годзе ў аварыйнай і разрабаванай капліцы пачалі працаваць археолагі, ім удалося знайсці толькі расцярушаныя парэшткі чатырох асоб, рэшткі трун, гіпсавыя і драўляныя скульптуры, вопраткі, гузікі і кавалак слуцкага пояса (!). Дзякуючы іх працы нарадзілася думка аднавіць капліцу. Была падрыхтавана праектная дакументацыя, але з-за адсутнасці сродкаў работы пачаць не ўдалося.

У 2017 годзе была праведзена карэкціроўка праектнай дакументацыі, а чарговая — у 2019 годзе (па нарматывах праз два гады дакументацыя патрабуе карэкціроўкі). На той час кошт правядзення першачарговых рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ складаў 816 580 рублёў (амаль 380 000 долараў). Але ў мясцовым бюджэце такіх грошай не было. А на дабрачынны рахунак, адмыслова заведзены для збору сродкаў на аднаўленне капліцы, нічога па паступіла. І тады мясцовыя ўлады пайшлі, што называецца, ва-банк. Была пададзена заяўка на грант Прэзідэнцкага фонду. А пакуль заяўка разглядалася, са сродкаў абласнога суботніка было выдзелена 50 000 рублёў на правядзенне супрацьаварыйных работ. І ў кастрычніку 2019 года за капліцу ўзяліся спецыялісты "Брэстрэстаўрацыі" (філіял ААТ "Белрэстаўрацыя"). І пускавы комплекс (супрацьаварыйныя работы) быў разлічаны на год і завяршыўся ў лістападзе 2020. За гэты час на аднаўленне капліцы паступіла 200 000 рублёў з раённага бюджэту і 348 500 з Фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва. На гэтыя грошы быў адноўлены дах, звод даху і бакавыя вежы. А ў кастрычніку 2020 года на дах капліцы была ўсталявана шасціметровая вежа-шпіль з аўтэнтычным крыжам.

Каб даведацца, што было зроблена ў 2021 годзе, мы звярнуліся па каментар да спадарыні Іны Праневіч, начальніка адзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Драгічынскага раённага выканаўчага камітэта.

"У 2021 годзе, — адзначыла яна, — на правядзенне работ мы атрымалі 300 000 рублёў з Фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва і 300 000 нам выдзеліў раённы бюджэт. Да канца года мы плануем атрэстаўраваць цагляную кладку, атынкаваць фасад будынка і ўставіць у вокны каляровыя вітражы. Пасля чаго ў лістападзе будуць зняты рыштаванні і можна будзе прыехаць і пафатаграфаваць капліцу. Канчаткова ж знешнія працы будуць завершаны праз два гады, калі можна будзе дадаць ляпніну".

Пасля завяршэння ўнутраных работ у капліцы будзе створана халодная экспазіцыя, і капліцу змогуць наведаць турысты. А пакуль уваход туды надзейна перакрыты кратамі, а ўнутры стаяць рыштаванні.

Хацелася б, каб гэты выдатны прыклад стаў узорам для пераймання і ў іншых раёнах Беларусі. Хацелася б, каб капліцы ў Завушшы і Усаве таксама знайшлі сваіх руплівых гаспадароў. Бо, вядома ж, і яны маюць сваю гісторыю.

К

Завяршэнне
(Пачатак у № 33, 2021)

Рафал Слізень, скульптар з Наваградчыны

У 1826 годзе клас скульптуры пры Віленскім універсітэце, які ачольваў Казімір Ельскі, загадам цара Аляксандра I быў скасаваны. Але той кароткі перыяд часу, які праіснаваў гэты клас (заснаваны ў 1803 годзе), усё ж прынёс свае плады. Сёння мы распавядзем пра лёс Рафала Слізеня, скульптара-аматара, ураджэнца Наваградчыны.

Зміцер ЮРКЕВІЧ

Рафал Слізень, фота XIX ст.

Дзіцячыя гады

Нарадзіўся Рафал Слізень 9 ліпеня 1804 года ў фальварку Бартнікі, які трымалі ў арэндзе яго бацькі і які доўгі час выконваў ролю цэнтральнай сядзібы гэтай галіны роду. Недзе ў 1807 годзе Рафала і брата Атона (1806-1887) бацькі аддалі на выхаванне да дзядоў па матчынай лініі — Юзэфа і Марцяны з Букоўскіх Мацкевічаў, старадубскіх стражнікаў і гаспадароў маёнтка ў Друцкаўшчыне (Нясвіжскі раён, блізу чыгуначнай станцыі Пагарэльцы). На мясцовых могілках у Друцкаўшчыне захавалася капліца-пахавальня Слізеняў (патрабуе апекі), вакол якой нямала паасобных пахаванняў прадстаўнікоў гэтага роду.

У 1811 годзе бацькі вярнулі хлопцаў на "радзіму" і аддалі ў базыльянскую школу ў Вольнай. У 1814-м Рафал і Атон распачынаюць вучобу ў славутай дамініканскай школе ў Наваградку, дзе ў тыя час вучыліся Ян Чачот і Адам Міцкевіч. А яшчэ праз два гады, у 1816-м, браты ізноў збіраюцца ў дарогу.

Іх універсітэты

Вучоба ў Полацкай езуіцкай акадэміі, куды бацькі адправілі падлеткаў, была раптоўна абарваная 20 сакавіка 1820 года, калі акадэмія была закрыта. Каб завершыць адукацыю, Слізені пераводзяцца ў Віленскі ўніверсітэт, Рафал на факультэт усіх навук маральных і палітычных, а Атон на фізіка-матэматычны (вучыў там фізіку, хімію, заалогію, батаніку і мінералогію). Рафал, як больш схільны да гуманітарнага кірунку, вучыўся яшчэ і на факультэце літаратуры і прыгожых мастацтваў пад кіраўніцтвам славутага мастака Яна Рустэма. Менавіта тады праявіліся яго творчыя здольнасці, і з пад пэндзля і пяра Рафала выйшлі ў свет акварэльныя шматлікія партрэты і карыкатуры, а таксама накіды алоўкам Францішкі з Анцутаў Верашчакі (цётка Ігната Дамейкі) і яе сына Міхала Верашчакі (брат Марылі, каханай Адама Міцкевіча, герой балад Чачота і Міцкевіча). Там, у Вільні, у 1821-1822 гадах браты трапляюць пад апеку Тамаша Зана, які становіцца іх гувернёрам і сябрам сям'і. Зразумела, што не толькі гэта, а таксама зямляцтва з галоўнымі філарэтамі — Адамам Міцкевічам, Ігнатам Дамейкам, Ануфрам Петрашкевічам, Янам Чачотам і інш., — прывяло Слізеняў у філарэцкае кола. У тыя часы вучыцца ва ўніверсітэце і не быць або прамяністым, або філарэтам ці сябрам іншай студэнцкай суполкі было, як падаецца, проста немагчыма. Але афіцыйным сябрам філарэтаў стаў толькі Атон (Ружовы саюз), хоць імя Рафал таксама ёсць у спісах "злачынцаў".

Таму, калі ў лістападзе 1823 года распачаўся працэс філаматаў-філарэтаў, браты, а таксама іх сябры, трапілі за краты. Праўда, увязненне ў мурах Дамініканскага кляштара не зацягнулася. Ужо ў снежні, дзякуючы бацьку і князю Канстанціну Радзівілу (гаспадару блізкай да Бартнікоў Паланечкі), хлопцаў вызвалілі. Атрымаўшы волю, Слізені арганізавалі ў Бартніках збор фінансавай дапамогі для тых дзясяткаў сяброў, што засталіся за кратамі.

Праўда, перад гэтым былі яшчэ цалкам сабе шчаслівыя 1821-1823 гады, калі сядзіба Слізеняў у Бартніках, з-за блізкасці да Туганавічаў, Заводсся, Медвядкі, стала філамацка-філарэцкай Меккай. Тут на вакацыях бавілі час і Зан, Чачот, Дамейка і інш. Ставіліся сіламі самых студэнтаў тэатральныя пастаноўкі. Менавіта ў Бартніках у якасці актора і рэжысёра-аматара пачынаў віленскі шкаляр Юзэф Сурэвіч, які ў будучыні стаў адным з самых вядомых актораў Віленскага тэатра, а потым вельмі доўгі час быў яго дырэктарам (пра гэту амаль невядомую ў нас асобу мы распавядзем у бліжэйшых нумарах "К").

Метрыка смерці Рафала Слізеня.

Яўстах Тышкевіч, 1850.

Супрацоўнік МУС

Закончыўшы ці ў 1824, ці ў 1826 гадах вучобу ва ўніверсітэце, Рафал пераехаў у Санкт-Пецярбург, атабарыўся на Фантанцы і паступіў на службу ў Міністэрства ўнутраных спраў. Тут, у Пецярбургу, яго сцяжынкі перакрыжаваліся са сцяжынкамі вядомых мастакоў — Аляксандра Арлоўскага і Вінцэнта Смакоўскага (якому Рафал аказваў матэрыяльную дапамогу). Дзякуючы камунікацыі з таленавітымі мастакамі, а таксама магчымасці знаёміцца з багатымі мастацкімі зборамі, у чыноўніку ізноў абудзіўся мастак. Менавіта тады ён узяў у рукі шматок гліны і пачаў ляпіць з яе медальёны. Адзін з іх Рафал прысвяціў славутай піяністцы Марыі Шыманоўскай (будучая цешча Адама Міцкевіча). Вядома ж, не раз бавіліся разам Слізень і Міцкевіч, які ў тыя часы адбываў сваё "выгнанне", раз'язджаючы паміж Пецярбургам і Адэсай.

Вяртанне на радзіму

У 1830 годзе Рафал Слізень развітаўся са "сталічным светам", бо стары бацька патрабаваў дапамогі па гаспадарцы. У гэтым годзе на пагорку блізу Бартнікоў была ўзведзена капліца-пахавальня, аб чым сведчыць выбіты на камяні надпіс: "Дом вечнасці. 1830" (гл. "К" № 31, 2021). Верагодна, гэта была першая спроба Рафала Слізеня ў якасці архітэктара. Як сцвярджаюць даследчыкі, пасля вяртання Рафал Слізень актыўна і паспяхова займаўся стварэннем праектаў сядзіб у стылі англійскай готыкі.

У 1832 годзе Рафал Слізень ажаніўся з графіняй Камілай Тышкевіч, дваюраднай сястрой Яўстаха і Канстанціна Тышкевічаў, вядомых сваёй апантанасцю ў зборы гістарычных памятак і беларускага фальклору.

Атон жа, які абраў вайсковую кар'еру, паўдзельнічаў у паўстанні 1831 года, але, каб пазбегнуць рэпрэсій, пасля задушэння паўстання паступіў на службу ў расійскае войска. Выйшаў у адстаўку у 1834-м і стаў гаспадарыць у Друцкаўшчыне, дзе напісаў вельмі цікавыя ўспаміны (часткова надрукаваныя).

Рафал, займаючыся "капітальным будаўніцтвам" для суседзяў, тым не менш знаходзіў час і для ўлюбёнай скульптуры. З гіпсу, гліны і бронзы ён стварыў больш за сотню статуэтак, бюстаў, партрэтных медальёнаў як вядомых дзеячаў гісторыі і культуры, так і свайго блізкага атачэння — сваякоў і сяброў. Сярод іншага ім зроблены медальёны графа Генрыка Жавускага, славутага пісьменніка з беларускімі каранямі, Юзэфа Каранёўскага, Клементыны Гофман, Яўстаха і Канстанціна Тышкевічаў, Тамаша Зана, Яна Чачота, Антона-Эдварда Адынца, Міхала Ромера, прафесара Адамовіча і многіх іншых. Невялічкі бюст Адама Міцкевіча быў падараваны у 1856 годзе Віленскаму музею старажытнасцей Тышкевічаў. Слізеню прыпісваюць таксама стварэнне мініяцюрных копій саркафагаў уладароў Рэчы Паспалітай.

Юльян Нямцэвіч.

Увогуле створаныя ім медальёны і бюсты маюць вельмі моцнае падабенства з творамі іншага скульптара-самавука Яна Астроўскага, ураджэнца Аршаншчыны (гл. "К" № 42, 43, 2021). Таму аўтарства аднаго і таго ж прадмета зрэдчас прыпісваюць то аднаму, то другому. Даходзіць да кур'ёзаў. Напрыклад, медальён Тамаша Зана мае подпіс Астроўскага, але прыпісваецца Слізеню.

На вялікі жаль, твораў і Астроўскага (які жыў толькі скульптурай), і Слізеня (для якога гэта было хобі) захавалася ў музеях вельмі і вельмі мала, хоць у свой час яны выраблялі бюсты і медальёны ў даволі значнай колькасці. Сёння працы Рафала Слізеня захоўваюцца ў Варшаве, Кракаве, Познані і ў Ракішках (Літва). Але на радзіме Астроўскага і Слізеня шукаць іх працы марна. Чарговы парадокс.

Апякун і настаўнік

Пад апекай Рафала Слізеня пэўны час знаходзіліся згаданы Ян Астроўскі, мастак Вінцэнт Смакоўскі, які з Пецярбурга перабраўся ў Вільню (у яго Слізень набыў некалькі твораў) і "Карупацкі, малады мастак з Вільні". А вядомы скульптар яўрэйскага паходжання Марк Антокальскі, ужо стаўшы вядомым, аддзячыў памяць настаўніка, развіваючы мастацкі талент дачкі Рафала, Марыі (скульптаркі, якая вучылася яшчэ і ў прафесара Грудэра ў Дрэздэне). У першай палове 1840-х гадоў Слізень распачаў збіраць малюнкі Яна Рустэма і вучняў факультэта літаратуры і прыгожых мастацтваў Віленскага ўніверсітэта, маючы намер выдаць іх у рэпрадукцыі разам з жыццярысамі аўтараў. У той самы час Слізень быў абраны ганаровым інспектарам школ у Ігумене.

А яшчэ сталі Рафал і Атон апекунамі Яна Чачота, які ў снежні 1844 года страціў працу ў Храптовічаў у Шчорсах і застаўся без сродкаў для існавання. Нягледзячы на тое, што Чачоты былі даволі разгалінаваным родам, не ў сваякоў, а ў сяброў Ян Чачот знайшоў прытулак. Год пражыў Чачот у Бартніках, потым год у Далматаўшчыне (у Антона Вярбоўскага, сябра-філарэта), а з восені 1846 па вясну 1847 Чачот жыў ужо ў Вольнай у Рафала.

Дарэчы, быў Слізень верным і ўдзячным сябрам Тамашу Зану. Калі той ехаў на сваё вяселле ў Лебедзева, Рафал падараваў яму чацвёрку коней. А потым маладыя падчас шлюбнага падарожжа завіталі і ў Бартнікі, і ў Вольна.

Пад Вільняй у Любава

Апошнія гады жыцця Рафал Слізень разам з сям'ёй жыў у Любаве, непадалёк ад колішняй сталіцы ВКЛ. У даведніках сцвярджаецца, што памёр Рафал 20 мая 1881 года або ў Вольным , або ў Любаве. Знойдзеная метрыка смерці ўсё расстаўляе па сваіх месцах. Смерць напаткала Слізеня 19 мая ў Любаве. Там жа яго і пахавалі — "в пещере под каплицей". Праўда, узрост Слізеня запісаны памылкова, бо яму было не 86 год, а 76.

Думкі

Улічваючы, што прац Рафала Слізеня і Яна Астроўскага ў Беларусі не захавалася, мо падумаць аб правядзенні выставы, каб пабачыць тое, што захоўваецца па-за межамі Беларусі?

К

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 397 01 63 (экскурсійнае бюро)

Пастаянныя экспазіцыі:
- "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
- "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
- "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
- "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
- "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".

Выставы:
- **"Фердынанд Рушчыц"**: віртуальная выстава да 150-годдзя з дня нараджэння.
- Віртуальная выстава твораў Віталя Чарнабрысава **"Вангогісты Гаген"**.
- **"Рака часу"**. Выстава твораў мастакоў Беларусі — юбіляраў 2021 года ў рамках праекта **"Нашы калекцыі"**.
- Выстава фарфору Эміліі Аляксандраўны Фокінай **"Мір фантазій"**.
- Выстава **"Леў Лейтман. Да 125-годдзя з дня нараджэння"**. Да 19 верасня.
- Выстава **"Святлана Каткова. Рэтраспекцыя"**. Да 3 кастрычніка.

■ Канцэрт у Дзень горада. 12 верасня 2021 г. а 12-й гадзіне ў Нацыянальным мастацкім музеі адбудзецца канцэрт навучэнцаў Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, прысвечаны Дню горада Мінска. У канцэрце прымуць удзел лаўрэаты міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, уладальнікі заахвочванняў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.
Прагучаць творы І.С. Баха, П. Чайкоўскага, М. Глінкі, С. Рахманінава, Ф. Шапэна, Р. Шумана, Ф. Шуберта, Ш.-К. Сен-Санса, Ф. Крэйслера, І. Лучанка, В. Іванова, А. Пажарыцкага і інш.

Філіялы музея
МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 358 88 78

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
- **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
- **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
- Зборныя экскурсіі па асноўнай экспазіцыі музея Ваньковічаў. 11, 18, 25 верасня 2021 г. – 14:00 і 16:00.
- Выстава аўтарскай лялькі Ірыны Прокоф'евай "Увасабленне" з 15 верасня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Повязь часоў"**, якая знаёміць з багаццем вобразаў традыцыйнага ручніка.
- **Займальныя майстар-класы** па саломапляценню, вырабу традыцыйных лялек, пляценні паясоў (бранзалетаў). Патрапіць на майстар-клас можна ў любы працоўны дзень музея: серада — нядзеля з 10.00 да 17.00.

Папярэдні запіс абавязковы.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Някрасава, 3.
Тэл.: 399-09-78
Час працы: серада — нядзеля з 12:00 да 20:00
- Выставачны праект **"Адкрыты архіў VL"**, прысвечаны 70-гадоваму юбілею Валерыя Лабко.
- Персанальная выстава графікі Юрыя Якавенкі **"Астральны нацюрморт"**.
- Выстава маляванак **"Зоры-Зараніцы"** да 26 верасня.
- 11.09 і 12.09 пройдзе святкаванне Дня горада! Адбудуцца актыўнасці — майстар-класы, лекцыя, гараджане змогуць наведаць выставачныя праекты: "Горад М" Уладзіслава Каліты, "Выдраныя з кантэксту" Вікторыі Богуш і Жанны Клімовіч і "СтритАрт" пры ўдзеле Крысціны Башарымавай.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66. Музей працуе: аўторак, серада, пятніца, субота, нядзеля — з 10.00 да 18.00 (касы да 17.30), чацвер — з 12.00 да 20.00 (касы да 19.30) панядзелак — выхадны.
Пастаянная экспазіцыя.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА "НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19
тэл.:+375177020602, 20660, +375295518051, +375291903149

Палацавы ансамбль:
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выставачны праект **"Захавальнікі"** з фондаў музея-запаведніка "Нясвіж" (куфры, шкатулкі, скрыні XVII — XX стст.) да 20 верасня.
- Выставачны праект **"Несучаснае мастацтва"** твораў М.Байрачнага і Ю.Гудзіновіча да 14 лістапада.
- Міжнародны выставачны праект "Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара" — у складзе пастаяннай экспазіцыі.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці:
г. Нясвіж, вул. Гейсіка,1
- Часовая экспазіцыя твораў Леаніда Гоманава "Фарбы зямлі" — з 3 жніўня 2021 г. па 30 верасня 2021 г.

Ратуша:
г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3
- Пастаянная экспазіцыя.

Слуцкая брама:
- Персанальная выстава Карыны Гінько — да 4 кастрычніка.

Падрабязную інфармацыю можна даведацца па тэлефонах (+3751770) 20602, (+3751770) 20660 альбо на сайце niasvizh.by.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі"**.
- Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
- Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя"**.
- Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
- Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар…"**, **"Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак"**, **"Капрызы моды ракако"**.
- Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
- Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
- Музейная фотапляцоўка.
- **Квэст "Таямніца двух куфраў"**.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.

- Фестываль мастацтва "Арт-Мінск-2021" з 3 жніўня да 26 верасня.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

магазіны "Белдрук"
- Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".
- Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".
- Праспект Незалежнасці, 44.
- Вуліца Валадарскага, 16.

кіёскі "Белдрук"
- ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.
- Праспект Пераможцаў, 5.
- Вуліца Рабкораўская, 17.
- Праспект Незалежнасці, 68, В.
- Вуліца Лабанка, 2.

Тэлефон для даведак па наяўнасці газеты ў кіёсках "Белдрук" — (017) 2764542 (з 9.00 да 17.30)

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
- **11 — "Шчаўкунок"** (балет у 2-х дзеях) П. Чайкоўскага. Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак у 19.00.
- **11 — Канцэрт "Шэдэўры сусветнай оперы"**. Камерная зала. Партыя фартэпіяна — А. Алімпіева. Рэжысёр — Наталля Кузьмянкова. Пачатак у 19:30.
- **12 — "Аіда"** (опера ў 4-х дзеях) Дж. Вердзі. У партыі Радамеса — заслужаны артыст Расіі Міхаіл Губскі (Маскоўскі тэатр "Новая Опера" імя Я.У. Колабава). Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак у 18.00.
- **14 — "Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж. Бізэ. Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак у 19.00. 18:15 – творчая сустрэча з Нінай Ламановіч у камернай зале.
- **15 — "Лебядзінае возера"** (балет у 2-х дзеях) П. Чайкоўскага. Дырыжор – Уладзімір Авадок. Пачатак у 19.00.
- **15 — Канцэрт "Старадаўнія рамансы"**. Камерная зала. Пачатак у 19.30.
- 16 — "БАГЕМА" (опера ў 4-х дзеях (выконваецца з адным антрактам)) Д. Пучыні. Дырыжор – Алег Лясун. Пачатак у 19.00.
- 17 — "Ганна Карэніна" (балет ў 2-х дзеях) П. Чайкоўскага. Дырыжор – Алег Лясун. Пачатак у 19.00.
- 18 — "Фаўст" (опера ў трох дзеях) Ш.Гуно. Дырыжор – Уладзімір Авадок. Пачатак у 19.00.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 154 04 44.
- **13 — "Гэта ўсё яна"** (драма) А.Іванова.
- **14 — "Адамавы жарты"** (камедыя) С.Навуменкі.
- **15 — "Сірожа"** (жыццё ў дзвюх эпохах) Ю.Чарняўскай.
- **16 — "Тры Жызэлі"** (драма) А. Курэйчыка.
- **17 — "Беларусь. Дыдактыка"** (дарога да сябе). Рэжысёр-пастаноўшчык: А. Марчанка.

Сёння і заўтра ў Нясвіжскім замку адбудуцца "Музычныя ГРАНД вечары". У Тэатральнай залі прагучаць выбітныя творы сусветнай фартэпіяннай і вакальнай класікі — ад барока да рамантызму. Менавіта такая музыка магла тут гучаць пры колішніх уладарах палаца. А ва ўнутраным дворыку сёння пройдзе яшчэ і традыцыйны "Гранд кірмаш" у стылі 1920 — 1930-х гадоў.

ГРАНД у Нясвіжы

Надзея БУНЦЭВІЧ

Нясвіжскі замак даволі рэгулярна запрашае гасцей на разнастайныя музычныя і тэатральныя імпрэзы. Сярод самых буйных такіх праектаў — фестываль "Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў", што праходзіць тут з 2010 года і за гэты час утрымліваў у сабе ажно 65 розных спектакляў і канцэртаў. А вось цяперашні музычны праект ладзіцца ў Нясвіжы ўпершыню. Арганізатарамі выступілі канцэртнае агенцтва "Арт-Гранд" і Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж", іх падтрымаў Цэнтр культуры і мастацтваў "Рэнесанс класікі".

Асаблівасць "Музычных ГРАНД вечароў" у тым, што яны не проста прапануюць наведвальнікам добрую музыку ў выдатным выкананні, але і вяртаюць традыцыі салоннага музіцыравання, што калісьці панавалі і тут, і ў іншых сядзібах Беларусі. Таму без інтэрактыву не абыдзецца.

Яшчэ адна адметнасць: гэта будуць у поўным сэнсе слова сямейныя вечарыны. За каралеўскім белым раялем апынуцца муж і жонка — Арцём і Марына Шаплыкі, якія будуць граць і паасобку, і разам — у чатыры рукі. Да іх далучыцца саліста Беларускай дзяржаўнай філармоніі, лаўрэат міжнародных конкурсаў Вольга Міцкевіч, у выкананні якой прагучаць вакальныя нумары.

Дарэчы, Арцёма многія таксама ведаюць як канцэртуючага філарманічнага саліста, лаўрэата шматлікіх конкурсаў. Разам з жонкай ён заснаваў прыватную музычную школу, дзе займаюцца не толькі дзеці, але і дарослыя. Тры тыдні таму было адкрыта яшчэ і эстраднае аддзяленне — акурат у тым будынку, дзе месціцца Беларускі саюз кампазітараў. Неблагое суседства! Дый само адкрыццё з майстар-класамі і выступленнямі аказалася не толькі ўрачыстым і цікавым, але і даволі крэатыўным, з нечаканымі прыдумкамі, інтэрактывам. Бо Гранд — гарант шчырай, разняволенай творчасці, што прыносіць радасць і выканаўцам, і слухачам.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").